Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

28 снежня 2009 года, № 22-23 (2015-2016)

ФОТАФАКТ

Фота БелТА

За вялікі ўклад у будаўніцтва Саюзнай дзяржавы рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка ўзнагароджаны ордэнам Дружбы Расійскай Федэрацыі.
Гэту высокую ўзнагароду яму ўручыў Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў.
Урачыстая цырымонія адбылася ў Крамлі пасля пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое было прымеркавана да 10-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Чытайце ў нумары:

ВА ЎСІХ КУТКАХ СВЕТУ

Міжнародная дзейнасць БДУ ўражвае сваім размахам

Стар. 2

МАТЭМАТЫКА БЛІЗКАЯ ДА БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА

Гутарка з цудоўнай жанчынай прафесарам-матэматыкам Рэгінай ТЫШКЕВІЧ

Стар. 4

ЖУРНАЛІСТЫКА СПАСЦІГАЕЦЦА НА ПРАКТЫЦЫ

Інтэрв'ю з дырэктарам Інстытута журналістыкі Сяргеем ДУБОВІКАМ з нагоды 65-годдзя факультэта журналістыкі

Стар. 5

ХТО, КАЛІ НЕ МЫ...

Рэспубліканскі студэнцкі форум "Народжаныя ў Беларусі" сабраў прадстаўнікоў 24 ВНУ

Стар. 8

2010

Паважаныя выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, аспіранты і магістранты!

Шчыра і сардэчна віншую з Калядамі і Новым годам!
Спадзяюся, што разам з гэтымі святамі ў жыццё кожнага прыйдзе шмат радасці, шчасця, цудоўнага настрою!
Няхай удачы мінулага года натхняюць на далейшыя здзяйсненні, а набыты вопыт загартоўвае для плённай працы на карысць Беларусі, універсітэта, сям'і, сяброў і сябе саміх!
Жадаю моцнага здароўя і дабрабыту!
Веру, што ў наступным годзе БДУ чакаюць новыя поспехі і дасягненні!

Рэктар акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА

УШАНАВАННІ

Дыплом "Ганаровы прафесар БДУ" ўрачыста ўручаны 27 лістапада на пасяджэнні Вучонага савета універсітэта Генеральнаму сакратару Міжнароднага саюза электрасувязі (ITU) доктару Хамадуну ТУРЭ.

Адзнака электрасувязі

Ганаровага звання спадар Турэ ўдастоены за заслугі ў навуковай і педагагічнай дзейнасці і ўклад у развіццё міжнароднага супрацоўніцтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта з навучальнымі і даследчымі ўстановамі свету.

Падчас візіту ў Мінск Хамадун Турэ азнаёміўся з навукова-тэхнічным патэнцыялам універсітэта, выступіў перад супрацоўнікамі і студэнтамі і адказаў на іх пытанні.

ДАВЕДКА

Ураджэнец Малі д-р Хамадун Турэ займае пост Генеральнага сакратара ITU з 2006 г.

Ён атрымаў вышэйшую адукацыю і дыплом інжынера па спецыяльнасці многаканальнаяэлектрасувязь(МЭС) у Ленінградскім электратэхнічным інстытуце сувязі, навуковую ступень кандыдата тэхнічных навук у Маскоўскім тэхнічным універсітэце сувязі і інфарматыкі.

Доўгі час ён працаваў у Міжнароднай арганізацыі спадарожнікавай сувязі (Інтэлсат), узначальваў Інтэлсат па Афрыканскім рэгіёне, а затым быў дырэктарам групы Афрыкі і Блізкага Усходу. На гэтых пасадах ён кіраваў штогадовымі аб'ёмамі на суму звыш 115 млн дол. ЗША.

Ён добра вядомы ў сувязі з ажыццяўленнем такіх праектаў, як Афрасат, Афсат, Панафтэл (Панафрыканская сетка электрасувязі), а таксама дзякуючы яго ўкладу ў працу шматлікіх канферэнцый і сходаў МСЭ, Інтэлсат, RASCOM, ПАСЭ (Панафрыканскі саюз электрасувязі), Панафтэл і КАПТАК (Канферэнцыя адміністрацый пошты і электрасувязі Цэнтральнай Афрыкі).

Алена МАРЦУЛЕВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Ва ўсіх кутках свету

Памятны знак Федэральнага касмічнага агенцтва Расіі "За заслугі ў арганізацыі касмічнай дзейнасці" ўручыў 16 снежня ў Мінску рэктару БДУ акадэміку Сяргею Абламейку начальнік зводнага ўпраўлення арганізацыі касмічнай дзейнасці Раскосмаса Юрый Макараў.

***

Дэлегацыя Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў складзе прэзідэнта Навукова-даследчага цэнтра астраноміі імя Франсіска Х. Дуартэ (СІДА) Элоя Антоніо Сіра Галіндэса і галоўнага інжынера завода аптычных прыбораў і дэталяў, які праектуецца (ФІПА), Ібраіма Алехандра Кастаньяс Гранадзільё 16 снежня наведала БДУ.

Адбылася сустрэча венесуэльскіх гасцей з кіраўніцтвам, выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На ёй ішла размова пра магчымасці навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва ў галіне оптаэлектронікі, а таксама перспектывы навучання грамадзян Венесуэлы ў магістратуры і аспірантуры БДУ ў галіне кампутарнай тэхнікі, электронікі, механікі і оптыкі. Госці высока ацанілі адукацыйны і навуковы патэнцыял універсітэта і выказалі зацікаўленасць у далейшых кантактах.

***

Дамова аб супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і італьянскім універсітэтам горада Перуджа падпісана 11 снежня ў Мінску рэктарам БДУ акадэмікам Сяргеем Абламейкам і яго італьянскім калегам прафесарам Паола Росі.

Прадугледжваецца абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, дактарантамі для навучання, стажыроўкі і навучальнай практыкі. Плануецца таксама запрашэнне прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу для чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў, абмену досведам і інфармацыяй па навучальна-метадычнай працы, вучэбных планах і праграмах; арганізацыя сумесных навуковых даследаванняў, канферэнцый, семінараў і інш.; публікацыя вынікаў сумесных прац.

Акрамя таго, у рамках гэтага дакумента падпісана асобная дамова аб акадэмічных абменах. Удзельнікамі іх змогуць стаць да 250 студэнтаў, аспірантаў, магістрантаў і выкладчыкаў БДУ ў год. Фінансаванне бярэ на сябе італьянскі бок. Нароўні з Сяргеем Абламейкам і Паола Росі, дадзеную дамову падпісаў таксама прэзідэнт італьянскага фонду "Aiutiamoli a vivere" ("Дапаможам ім жыць") доктар Фабрыцыо Пачыфічы.

Даведка

Перуджа (Perugia) – інтэрнацыянальны студэнцкі горад у італьянскім рэгіёне Умбрыя. Універсітэт утвораны ў 1308 г. і з'яўляецца найстарэйшым у цэнтральнай Італіі. На 11 факультэтах навучаюцца каля 30 тыс. студэнтаў, у ліку якіх шмат замежнікаў.

***

Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка 15 снежня сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Славацкай Рэспублікі ў Беларусі Марыянам Серваткам.

Абмяркоўвалася магчымасць запрашэння ў БДУ выкладчыка славацкай мовы са Славакіі ў рамках дзейнай дамовы паміж міністэрствамі адукацыі дзвюх краін. Дарэчы, ва універсітэце ў Прэшаве (Славакія) ужо працуе наш выкладчык і вядзецца навучанне беларускай мове. У БДУ ў цяперашні час славацкая мова вывучаецца на філалагічным факультэце ў якасці другой мовы, а з новага навучальнага года мяркуецца адкрыць спецыяльнасць "Славянская мова (славацкая і руская філалогія)".

Марыян Серватка паведаміў, што славацкі бок гатовы прапанаваць стыпендыі для студэнтаў, якія вывучаюць славацкую мову, а таксама падарыць бібліятэцы БДУ навучальную літаратуру па славацкай мове і культуры. Акрамя таго, ён прапанаваў выйсці з ініцыятывай аб заключэнні дамовы аб супрацоўніцтве БДУ і Універсітэта Браціславы.

***

Дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Ісламскім універсітэтам "Азад" падпісана 11 снежня ў Мінску рэктарамі дзвюх ВНУ акадэмікам Сяргеем Абламейкам і доктарам Абдалой Джафаралі Джасбі.

Дамова прадугледжвае абмен студэнтамі, аспірантамі, дактарантамі для навучання, стажыроўкі і навучальнай практыкі, арганізацыю сумесных даследаванняў, канферэнцый, семінараў. Акрамя таго, бакі будуць спрыяць публікацыі навуковых, навучальных і метадычных матэрыялаў па выніках выканання сумесных прац, абменьвацца навукова-тэхнічнай, навучальна-метадычнай літаратурай і перыядычнымі выданнямі, дзяліцца досведам па пытаннях унутранага кіравання і міжнароднай дзейнасці.

Даведка

Ісламскі універсітэт "Азад" – найбуйнейшая ВНУ не толькі ў Іране, але і на Блізкім Усходзе, у 375 цэнтрах і падраздзяленнях якой навучаюцца 1 млн 400 тыс. студэнтаў па спецыяльнасцях медыцынскага і інжынернага профілю, а таксама базавых і гуманітарных навуках.

***

Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Інстытутам гуманітарнага права і правоў чалавека імя Рауля Валенберга універсітэта г. Лунд (Швецыя) падпісалі 1 снежня рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і дырэктар інстытута Лайф Хальмстром.

Мемарандум прадугледжвае ўзаемадзеянне ў галіне выдання навучальных дапаможнікаў па міжнародным гуманітарным праве для беларускіх ВНУ, абмен выкладчыкамі, арганізацыю семінараў, партнёрства ў сферы бібліятэчнай справы і па іншых кірунках.

***

Перспектывы супрацоўніцтва БДУ і Акадэміі Паморскай горада Слупска (Польшча) абмеркавалі 2 снежня рэктары дзвюх ВНУ акадэмік Сяргей Абламейка і прафесар Раман Дрозд.

Раман Дрозд прыязджаў у Мінск на мерапрыемствы з нагоды юбілею філалагічнага факультэта, з якім акадэмія развівае цесныя сувязі ў рамках дамовы аб супрацоўніцтве паміж дзвюма ВНУ ад 2006 г. Сяргей Абламейка і Раман Дрозд абмеркавалі магчымасці пашырэння партнёрскіх адносін і з іншымі факультэтамі БДУ, напрыклад, гістарычным, геаграфічным, біялагічным і дауніверсітэцкай адукацыі, а таксама ў навуковай сферы. Дарэчы, у гэтай польскай ВНУ працуюць выкладчыкамі 16 выхадцаў з БДУ.

***

Дамову аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Ніжагародскім дзяржуніверсітэтам імя М.І. Лабачэўскага падпісалі 3 снежня рэктары дзвюх ВНУ акадэмік Сяргей Абламейка і прафесар Яўген Чупруноў.

Ніжагародскі дзяржаўны універсітэт імя М.І. Лабачэўскага заснаваны ў 1916 г. На сёння ў ім вучацца каля 40 тыс. чалавек, уключаючы амаль тысячу аспірантаў і дактарантаў. У складзе: 19 факультэтаў, 132 кафедры, 5 навукова-даследчых інстытутаў. Навучанне праводзіцца па 46 спецыяльнасцях, 15 кірунках падрыхтоўкі магістраў (56 праграм), 23 кірунках падрыхтоўкі бакалаўраў, а таксама па праграмах са скарочаным тэрмінам навучання. Навукова-педагагічную працу вядуць 300 дактароў і 900 кандыдатаў навук, 17 правадзейных членаў і членаў-карэспандэнтаў РАН.

У лістападзе гэтага года ВНУ прысвоеная катэгорыя "нацыянальны даследчы універсітэт". Такіх універсітэтаў зараз у Расіі 14, з іх толькі 2 класічныя: Новасібірскі і Ніжагародскі. У афіцыйных рэйтынгах універсітэт стабільна знаходзіцца сярод дзесяці найлепшых універсітэтаў Расіі.

***

Дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Катарскім універсітэтам падпісана падчас візіту з 24 па 26 лістапада ў Катар прарэктара па навуцы акадэміка Алега Івашкевіча.

З катарскага боку выказана зацікаўленасць у развіцці сумесных даследаванняў у галіне экалогіі, ачысткі вады і паветра, распрацоўкі сродкаў для антыкаразійнай абароны карпусоў марскіх суднаў. Дасягнута дамоўленасць аб візіце катарскай дэлегацыі ў БДУ ў 2010 г. для абмеркавання канкрэтных праектаў.

У рамках візіту Алег Івашкевіч прыняў удзел у пасяджэнні Беларуска-Катарскага Сумеснага Камітэта, на якім была прэзентавана навуковатэхнічная прадукцыя БДУ. Адбыліся перамовы з прадстаўнікамі Катарскага фонду і Катарскай Нацыянальнай Праграмы, а таксама з прадстаўнікамі Вышэйшага Савета па інфарматызацыі і камунікацыйных тэхналогіях Катара, якія выказалі вялікую зацікаўленасць у распрацоўках, скіраваных на забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі і суперкампутараў. Дасягнутая дамоўленасць аб наведванні нашай краіны ў найбліжэйшы час экспертамі і спецыялістамі Дзяржавы Катар.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Наблізілі Далянь

На здымку (злева направа): дырэктар РІК імя Канфуцыя БДУ В. Стражай, прарэктар ДПУ па міжнародных сувязях Нін Гуэйлін і рэктар БДУ С. Абламейка

У Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ з'явіўся новы і вельмі паважаны партнёр – Далянскі політэхнічны універсітэт.

Заключэнне адпаведнага пагаднення стала вынікам візіту ў Кітай у канцы лістапада рэктара Белдзяржуніверсітэта акадэміка Сяргея Абламейкі і дырэктара РІК імя Канфуцыя БДУ прафесара Васіля Стражава. З кітайскага боку дамову аб партнёрстве ў справе развіцця і забеспячэння дзейнасці РІК імя Канфуцыя падпісаў рэктар ДПУ акадэмік Оу Цзыньпін. Згодна з дамовай створаны Савет кіравання інстытутам на чале з рэктарам БДУ, у які ўвайшлі па тры чалавекі з кожнага боку. Задачай дадзенай структуры стане вызначэнне стратэгіі развіцця інстытута, узгадненне сумесных праектаў і падрыхтоўка неабходных дакументаў у дзяржаўную канцылярыю КНР (Ханьбань) на атрыманне фінансавання. Па словах В. Стражава, з Далянскім політэхнічным універсітэтам і раней існавалі шчыльныя кантакты, цяпер жа супрацоўніцтва выйдзе на новы ўзровень. Прадугледжваюцца між іншым такія сумесныя праекты, як эканамічная вучоба, культурны абмен, азнаямляльныя паездкі студэнтаў, а таксама выданне перакладной літаратуры.

Далянскі політэхнічны універсітэт – адна з найбуйнейшых ВНУ Кітая. Яна мае статус вышэйшай навучальнай установы цэнтральнага падпарадкавання (усяго такіх ВНУ 20), якая падлягае ўзмоцненаму дзяржаўнаму забеспячэнню. Нароўні з класічнымі універсітэцкімі факультэтамі (матэматычным, прыродазнаўчым і гуманітарным) у яго структуры маюцца і падраздзяленні інжынернага профілю.

10-14 снежня прафесар В. Стражаў здзейсніў яшчэ адну паездку ў Кітай для ўдзелу ў Пекіне ў IV Сусветнай канферэнцыі дырэктараў інстытутаў Канфуцыя. На сёння налічваецца болей за 300 такіх установ па ўсім свеце, 60 з якіх у краінах Еўропы (а яшчэ каля 30 у краінах СНД). Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ прадставіў два стэнды з прэзентацыяй сваёй дзейнасці.

17-19 снежня ўжо ў Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя "Кітай у сучасным свеце", арганізатарам якой выступіў РІК імя Канфуцыя БДУ. У ёй бралі ўдзел спецыялісты з Беларусі, КНР, Расіі, Арменіі і Кыргызстана.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ

ЦЯПЕР І КАРЭЯЗНАЎЦЫ

Урачыстае адкрыццё Цэнтра карэязнаўства адбылося 1 снежня на факультэце міжнародных адносін.

У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і пасол Рэспублікі Карэя ў нашай краіне Лі Енсу.

У Цэнтры карэязнаўства будзе паглыблена вывучацца гісторыя і культура Карэі, нацыянальная мова, сучасны эканамічны і палітычны стан. Мяркуецца таксама развіццё навукова-даследчай дзейнасці ў галіне карэязнаўства і падтрымка супрацоўніцтва з арганізацыямі і універсітэтамі Карэі і Беларусі.

На сёння ў Цэнтры сфарміраваны унікальны і пакуль яшчэ адзіны фонд навуковай і навучальнай літаратуры на карэйскай мове, што дазволіць выкладчыкам і студэнтам працаваць з арыгінальным матэрыялам па мовазнаўстве, гісторыі, мастацтве, краіназнаўстве. На яго базе плануецца арганізацыя сустрэч з карэйскай інтэлігенцыяй, правядзенне семінараў, канферэнцый, круглых сталоў і інш. Цэнтр абсталяваны сучаснай кампутарнай тэхнікай, маюцца аўдыё- і відэаматэрыялы моўнага і краіназнаўчага характару.

На канцэрце студэнты прадставілі музычныя творы на карэйскай мове.

БДУ – адзіная навучальная ўстанова ў Беларусі, дзе з 1999 г. вывучаецца карэйская мова. Ужо падрыхтавана 10 спецыялістаў па спецыялізацыі краіназнаўства. Цяпер больш за два дзесяткі студэнтаў факультэта міжнародных адносін вывучаюць мову і культуру Карэі. З імі займаюцца выкладчыкі Вольга Дзеравянка (яна ж дырэктар Цэнтра) і сп. Гіль Кун Сук, якая ўжо некалькі гадоў працуе на кафедры ўсходніх моў ФМА.

Лаліта ПАК

НАШ ВЫБАР

НА НОВЫ ТЭРМІН З ВЯЛІКІМІ ПЛАНАМІ

Прайшла XXXIV справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў БДУ

Каля 400 дэлегатаў канферэнцыі заслухалі справаздачу прафсаюзнага камітэта БДУ і рэвізійнай камісіі аб працы за апошнія 5 гадоў і ў выніку прызналі дзейнасць пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі задавальняючай. Яўген Туромша абраны старшынёй прафкама яшчэ на адзін тэрмін. Яго намеснікам – Аляксандр Нікіценка. У новы склад прафсаюзнага камітэта БДУ ўвайшлі 65 чалавек з усіх падраздзяленняў універсітэта.

На канферэнцыі неаднаразова падкрэслівалася, што дзякуючы калектыўнаму дагавору ўдаецца вырашаць многія важныя пытанні супрацоўнікаў і задавольваць іх сацыяльна-эканамічныя інтарэсы. А менавіта: дадатковыя выплаты да працоўнага адпачынку, да дня заснавання БДУ, аказанне матэрыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з "Палажэннем аб парадку выкарыстання фонду матэрыяльнай дапамогі БДУ" і многія іншыя. На сёння супрацоўнікі універсітэта па заяве могуць атрымаць адпачынак без захавання заработнай платы па сямейных абставінах і іншых уважлівых прычынах. Жанчынам, якія выхоўваюць аднаго ці больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, па іх заяве штомесяц прадастаўляецца адзін вольны дзень з захаваннем сярэднядзённага заробку. Падобную карысную інфармацыю змяшчае раздзел 6 "Дадатковыя льготы і гарантыі супрацоўнікам" Калектыўнага дагавора.

На канферэнцыі пастанавілі і надалей з дапамогай Калектыўнага дагавора рэгуляваць пытанні аплаты працы, паляпшэння яе ўмоў, абароны прафесійных правоў работнікаў. Прафсаюзны камітэт, згодна з рашэннямі канферэнцыі, павінен максімальна выкарыстоўваць уласную базу адпачынку САК "Брыганціна" для аздараўлення супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў, а таксама развіваць турызм. Прафсаюзы збіраюцца ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу калектываў фізкультуры і спартыўнага клуба, а таксама ствараць новыя фізкультурна-спартыўныя секцыі. Таксама на мэце – стварэнне ўласнага сайта арганізацыі. Што датычыцца такога важнага пытання, як жыллёвае, то прафкам намерваецца з нагоды 90-годдзя БДУ хадайнічаць перад дзяржаўнымі органамі аб выдзяленні яшчэ адной пляцоўкі для будаўніцтва жылога дома для супрацоўнікаў універсітэта.

Ганна ЛАГУН

Старшыня прафкама БДУ Яўген Туромша

ВЫСТАВЫ

Белдзяржуніверсітэт напрыканцы лістапада браў удзел у Нацыянальнай выставе Рэспублікі Беларусь у Маскве, а таксама ў мерапрыемствах VI Форума дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і горада Масквы.

Прасоўванне на Маскву

На здымку: з экспазіцыяй БДУ знаёмяцца прэм'ер-міністр Беларусі С. Сідорскі, намеснік мэра Масквы С. Байдакоў, першы намеснік старшыні ДКНТ Беларусі У. Нядзілька

На Нацыянальнай выставе Рэспублікі Беларусь экспазіцыю БДУ наведалі беларускія і расійскія афіцыйныя асобы: прэм'ер-міністр Беларусі С. Сідорскі, намеснік мэра расійскай сталіцы С. Байдакоў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі В. Далгалёў, першы намеснік старшыні ДКНТ Рэспублікі Беларусь У. Нядзілька і інш. Пры азнаямленні з экспазіцыяй Сяргей Сідорскі даў высокую адзнаку распрацаваным у Беларускім дзяржаўным універсітэце медыцынскім прэпаратам і выказаў гатоўнасць садзейнічаць у прасоўванні на расійскі рынак супрацьпухліннага сродку "Цысплацел".

Навукова-тэхнічныя распрацоўкі універсітэта таксама былі прадстаўленыя на выставе-прэзентацыі інвестыцыйных і інавацыйных праектаў Масквы і Рэспублікі Беларусь.

Члены нашай дэлегацыі выступілі з дакладам па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, навукі і інавацый на пасяджэнні круглага стала, які адбыўся ў рамках Форума дзелавога супрацоўніцтва, а таксама ўдзельнічалі ў XVI пасяджэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва горада Масквы і Рэспублікі Беларусь.

Кірыл ШОПІК

Сельскагаспадарчы форум

Дэлегацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта 25-27 лістапада прыняла ўдзел у працы Форума вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі краін СНД у г. Ашгабад, Туркменістан.

На выставе БДУ прадставіў каля 20 навукова-тэхнічных распрацовак для сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці, зробленых у НДІ фізіка-хімічных праблем, НДІ ядзерных праблем, на біялагічным факультэце. Было праведзена больш за 50 перамоў з патэнцыйнымі спажыўцамі прадукцыі БДУ як у Туркменістане, так і ў Расіі, Украіне, Малдове, Казахстане, Латвіі.

З намеснікам міністра сельскай гаспадаркі Туркменістана Байрамам Хаджагулыевым абмеркаваныя пытанні пастаўкі ліній перадпасяўной апрацоўкі насення сельскагаспадарчых культур.

Праведзеныя перамовы з вядучымі спецыялістамі краін СНД у галіне дэзінфекцыі памяшканняў, абсталявання і жывёлы, а таксама ветэрынарыі ў мэтах заключэння кантрактаў на сумесныя распрацоўкі.

26 лістапада дэлегацыя ДКНТ і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь наведала Акадэмію навук Туркменістана. Супрацоўнікі БДУ азнаёмілі яе прэзідэнта Мурада Мезілава з даследаваннямі, якія вядуцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, і распрацоўкамі лабараторыі радыёфізічных даследаванняў НДІ ЯП. Падчас перамоў абмяркоўваліся магчымасці выканання сумесных праектаў па новых мікрахвалевых тэхналогіях; пастаўка і ўкараненне абсталявання для перадпасяўной мікрахвалевай апрацоўкі насення; пастаўка абсталявання для стэрылізацыі і сушкі сельгаспрадуктаў і фармпрэпаратаў.

Таксама дасягнутая дамоўленасць аб удзеле прадстаўнікоў БДУ ў міжнародным сімпозіуме "Праблемы выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі ў Туркменістане", які будзе праводзіцца ў Ашгабадзе 23-26 лютага 2010 г., і аб удзеле ў правядзенні Дзён навукі краін-удзельніц СНД у чэрвені 2010 г.

Сяргей САХАРУК,
начальнік аддзела рэкламнага і інфармацыйнага забеспячэння навуковых распрацовак

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: неарганічнай хіміі, міжнароднага турызму;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ міжнародных адносін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: неарганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, арганічнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, беларускай літаратуры і культуры, рускай літаратуры, славянскіх літаратур, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, агульнанавуковых дысцыплін, сучаснай беларускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: рускай літаратуры, раманскага мовазнаўства, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, раманскіх моў, агульнанавуковых дысцыплін, сучаснай беларускай мовы, прыкладной лінгвістыкі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: нямецкай мовы, сацыяльнай камунікацыі, крыніцазнаўства, нямецкага мовазнаўства.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасады

Прафесара кафедры рэабіліталогіі (1)

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДІКСТ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.

НДІ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ
АБ`ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасады

Навуковага супрацоўніка лабараторыі ядзернай оптыкі і космамікрафізікі – 1.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, каб. 315, тэл. 226-42-31.

НДІ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н.СЕЎЧАНКІ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

– Старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.07 (фізіка кандэнсаванага стану) – 1;

– Старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.01 (прылады і метады эксперыментальнай фізікі) – 1;

– Старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.17.06 (тэхналогія і пераапрацоўка палімераў і кампазітаў) – 1;

– Навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.01 (прылады і метады эксперыментальнай фізікі);

– Малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.11.00 (прыборабудаванне) – 1;

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7; тэл. 212-48-43.

ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

Старшых выкладчыкаў кафедры агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін – 3.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Тел.: 328-55-34; 220-29-46.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Інтэрв'ю з рэктарам БДУ акадэмікам С. Абламейкам "БДУ: альянс навукі і адукацыі" – "7 дней" (19.11).

Інтэрв'ю з дырэктарам Музея глебазнаўства В. Смаляковай – "Обозреватель" (11.12).

Выстава-кірмаш "Каменная казка" – "Звязда" (15.12); "Вечерний Минск" (15.12);

Дамова аб супрацоўніцтве БДУ з Ісламскім універсітэтам "Азад" – БелТА (11.12); tut.by (11.12); sb.by (12.12); "Минск-новости" (15.12).

Сумесная калегія рэктарата БДУ і Мінгарвыканкама – "Настаўніцкая газета" (12.12); Минский курьер" (09.12); "Вечерний Минск" (10.12).

Дамова БДУ з універсітэтам Перуджы (Італія) – БелТА (11.12); "Минск-новости" (10.12);

Пра каманду студэнтаў БДУ – фіналістаў чэмпіянату свету па праграмаванні – "Чырвоная змена"/"Звязда" (10.12).

Інтэрв'ю з дырэктарам Цэнтра палітычных і сацыялагічных даследванняў БДУ Д. Ротманам – "Народная газета" (09.12); "Звязда" (15.12).

Адкрыццё Вучэбнага цэнтра кампаніі D-Link у БДУ – Минск-новости" (07.12); БелТА (15.12).

Да 70-годдзя філалагічнага факультэта БДУ – "Звязда" (04.12); "Знамя юности" (11.12).

Дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Ніжагародскім універсітэтам – БелТА (03.12); "Минск-новости" (04.12); "Знамя юности" (04.12); РІА "Время Н", unn.ru (08.12).

Дні адкрытых дзвярэй – "Минский курьер" (08.12); "Звязда" (03.12); "7 дней" (10.12).

Адкрыццё новай спецыяльнасці "менеджмент у журналістыцы" ў Інстытуце журналістыкі БДУ – "Знамя юности" (03.12); БелТА (03.12); open.by (03.12).

Пра даследванні лабараторыі ядзернай оптыкі і космамікрафізікі НДІ ядзерных праблем БДУ – "Минский курьер" (03.12).

Пра дзейнасць "Юні-цэнтра" на ФПМІ – "Минский курьер" (03.12).

Інтэрв'ю з дырэктарам Інстытута журналістыкі С. Дубовікам – tut.by (02.12); "ЛіМ" (04.12).

Адкрыццё Цэнтра карэязнаўства на ФМА БДУ – БелТА (29.11, 01.12); "Минский курьер" (01.12; 08.12); БелаПАН (01.12); "Знамя юности" (02.12); "Вечерний Минск" (02.12).

Інтэрв'ю з дэканам філалагічнага факультэта І. Роўдам – "Настаўніцкая газета" (01.12).

Адкрыццё аўдыторыі імя Барыса Стральцова ў Інстытуце журналістыкі БДУ і святкаванне 65-годдзя факультэта журналістыкі – БелТА (28.11); "Рэспубліка" (28.11, 02.12); "Советская Белоруссия" (01.12; 03.12); "Знамя юности" 04.12-10.12); "Звязда" (03.12); "Настаўніцкая газета" (05.12); "Вечерний Минск" (04.12); "Могилевская правда" (04.12); "Гродненская правда" (02.12; 09.12); "ЛіМ" (04.12); "7 дней" (03.12); "Минский курьер" (03.12); "Народная газета" (03.12).

Вечар памяці Ул. Караткевіча на гістарычным факультэце БДУ – "Вечерний Минск" (04.12).

Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры славянскіх літаратур І. Чаротам – "Рэспубліка" (01.12).

Уручэнне дыплома "Ганаровы прафесар БДУ" Генеральнаму сакратару Міжнароднага саюза электрасувязі Хамадуну Турэ – БелТА (27.11).

Вечар-прэзентацыя "Давайце пазнаёмімся!" з удзелам замежных грамадзян, якія вучацца на ФДА БДУ – "Знамя юности" (27.11).

Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ прафесарам В. Калядой – "Настаўніцкая газета" (26.11).

Студэнцкі форум "Народжаныя ў Беларусі" – БелТА (24.11); "Народная газета" (26.11); "Минск-новости".

Дырэктар ЦІТ БДУ Ю. Варатніцкі пра ўвядзенне ў эксплуатацыю ў БДУ суперкампутара "СКІФ К-1000" – "Настаўніцкая газета" (24.11).

Прэзентацыя праекта БДУ "Экзамен.KZ" – БелТА (21.11); zn.by ("Знамя юности", 22.11)

ВІНШУЕМ!

неСПРАВЯДЛІВЫ ЮБІЛЕЙ

Ва універсітэце 4 снежня шырока святкавалі 70-годдзе філалагічнага факультэта. На гэтым прамежку філфак гасцінна адчыняе свае дзверы ўсім, хто прагне спасцігнуць таямніцы моў, літаратур, культур, рыхтуючы годных спецыялістаў у галіне мовазнаўства, літаратуразнаўства і прыгожага пісьменства.

Дэкан філфака Іван Роўда віншуе сваю папярэдніцу – Ларысу Мурыну

70 гадоў у памерах чалавечага жыцця, канечне, шмат, а ў памерах Сусвету – імгненне. Вось так і філфак, набраўшы жыццёвага вопыту, сфарміраваўшы сваю навуковую базу, як кажуць, цвёрда стаў на ногі, але ў той жа час адчувае сябе маладым і энергічным, здольным развівацца і ўдасканальвацца.

Філалагічны факультэт адзначыў сваё 70-годдзе, але, як заўважыў дэкан прафесар Іван Роўда, ужо праз год філфак мае права святкаваць і новы юбілей – 90-годдзе! Справа ў тым, што падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў ва універсітэце пачалася ў першы ж год яго заснавання (1921) на этнолага-лінгвістычным аддзяленні факультэта грамадскіх навук, потым працягвалася на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта. Своеасаблівае "магдэбургскае права" філфак атрымаў толькі ў 1939 г., таму з гэтай даты, не зусім справядліва, і вядзецца адлік.

Але галоўнае тое, што за такі фармальна невялікі час існавання факультэт мае вялікую гісторыю, яму сапраўды ёсць чым ганарыцца. У розныя часы тут навучаліся Іван Мележ, Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Рыгор Барадулін, а ў далёкія 1920-я гг. лекцыі па беларускай мове і методыцы яе выкладання чыталі Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Язэп Лёсік. Мала хто ведае, што студэнты-мовазнаўцы спрычыніліся ў якасці гідаў-перакладчыкаў да Маскоўскай алімпіяды 1980 г.

У межах свята прайшло шмат мерапрыемстваў. Сярод іх "Вязынка-2009", Тыдзень беларускай культуры і інш. Яшчэ была адкрыта адмысловая галерэя гісторыі беларускага пісьменства. Дзівоснае відовішча: калі ідзеш па калідоры на другім паверсе, а перад табой адна за другой паўстаюць карціны мінулага. Цудоўны падарунак для студэнтаў і выкладчыкаў!

Не засталіся ўбаку і шматлікія сябры факультэта і афіцыйныя асобы, якія прыйшлі на юбілейны вечар, каб павіншаваць філфак са святам, падзякаваць за сумленную працу і выхаванне і пажадаць далейшых поспехаў. Пачатак паклаў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, які раздаў шматлікія граматы і ўзнагароды.

Юбілей філфака быў асвечаны словам Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, якое было агучана кіраўніком аддзялення адукацыі Мінскай епархіі протаіерэем Аляксандрам (Шымбалёвым).

Сярод гасцей было шмат выпускнікоў філфака: намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў, начальнік упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Віктар Якжык і начальнік аддзела вышэйшай адукацыі Эдуард Шаўцоў, дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Уладзімір Адамушка, заслужаны дзеяч культуры паэт Уладзімір Карызна, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Аляксандр Лукашанец, дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка Франц Шумчык і многія іншыя.

Сімвалічна, што чарговую эстафету факультэту перадала дэкан у 1996-2002 гг. доктар педагагічных навук прафесар Ларыса Мурына.

Адчуць сапраўднае універсітэцкае братэрства можна было падчас выступлення дэканаў БДУ, а таксама намесніка старшыні Прэзідыума ВАК Аляксандра Данілава і дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі Генадзя Пальчыка.

Не застаўся ўбаку ад значнай універсітэцкай падзеі і дыпламатычны корпус: факультэт павіншавалі асабіста амбасадары Украіны, Германіі, Сербіі, Польшчы. Быў таксама зачытаны віншавальны адрас ад імя пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандра Сурыкава.

Наведаў альма-матэр і народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін разам з 23 сваімі аднакурснікамі, якія роўна 50 гадоў таму скончылі філалагічны факультэт. Многа цёплых слоў адрасавалі яны філфаку, з настальгіяй расказваючы пра свае студэнцкія гады. Кранальна, што падчас выступлення дзядзькі Рыгора зала – у знак павагі да Паэта – слухала яго стоячы.

Віншавальную тэлеграму-прысвячэнне філфаку даслаў і доктар філалагічных навук народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, які 35 год свайго жыцця аддаў роднаму факультэту.

І яшчэ адна падстава для гордасці. З восені 1923 г. на факультэце працаваў найвыдатнейшы педагог класік беларускай літаратуры Якуб Колас. А таму сімвалічна, што ўрачыстую частку завяршыў праўнук народнага Песняра студэнт 5 курса Юрый Кім.

Больш рытмічнай і распеўнай была другая палова вечара, неафіцыйная, бо прыйшоў час студэнцкі віншаваць факультэт. Гледачы пабачылі народныя танцы Кітая, Туркменістана, Турцыі, змаглі прасякнуцца харaством беларускіх песень і юнацкіх вершаў.

Аднак і старэйшыя паказалі свае таленты: старшы выкладчык кафедры раманскага мовазнаўства Людміла Мельнікава пранізліва праспявала на італьянскай мове твор А. Бачэлі, а выкладчык кафедры нямецкага мовазнаўства Дзмітрый Каралёў выканаў раманс на словы Гейнэ.

Такім чынам, святочныя мерапрыемствы да 70-годдзя прайшлі, нібы хвалі, якія прыгожа, імкліва, гучна накрываюць з галавой і пры гэтым прыносяць мора задавальнення і радасці.

Застаецца пажадаць філалагічнаму факультэту заставацца заўсёды маладым, таленавітым і самабытным, не згубіць творчы імпэт!

Лілія БОНДАР

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

АСОБЫ

Рэгіна ТЫШКЕВІЧ:

"МАТЭМАТЫКА НАЙБОЛЕЙ БЛІЗКАЯ ДА БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА"

Нядаўна справіла юбілей доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі Рэгіна ТЫШКЕВІЧ. Яна адзіная жанчына-прафесар на механіка-матэматычным факультэце і адна з вядучых у свеце спецыялістаў па тэорыі графаў. За шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства і заслугі ў галіне адукацыі яе ўзнагародзілі медалём Францыска Скарыны.

Свой шлях у матэматыку Рэгіна Іосіфаўна пачала з дзяцінства. З цеплынёй і ўдзячнасцю успамінае яна сваіх школьных настаўнікаў. У Іжэўску, куды была эвакуявана яе сям'я, яна сустрэлася з акцёрамі Музычнага тэатра. Апынуўшыся ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі, дзяўчынка ўвабрала любоў да навук і мастацтваў. Настаўніца літаратуры шмат чытала дзецям і дазваляла самастойна выказвацца аб прачытаных творах. А імя сваёй першай настаўніцы матэматыкі – Варвары Яўграфаўны – Рэгіна Іосіфаўна памятае дагэтуль.

Пасля вайны Рэгіну адправілі да цёткі ў Вілейку, каб паправіць здароўе дзяўчынкі пасля жыцця надгаладзь. Там яна скончыла дзесяты клас і пад апекай Антона Касабуцкага прасяк нулася асаблівай любоўю да матэматыкі.

"Каб зрабіць нешта сапраўднае, яно павінна ў нас увайсці, мы павінны з ім жыць", – кажа Рэгіна Іосіфаўна. І ўласным прыкладам даказвае гэтае правіла.

ГАРМОНІЯ ЛІКАЎ

Кажуць, матэматыка падобная да паэзіі. Герман Гесэ ў сваёй "Гульні шкляных перлаў" пераплятаў матэматыку і музыку, бачачы і ў тым і ў другім выразнасць, складнасць, гармонію. Рэгіна Тышкевіч даказала праўдзівасць гэтых сцвярджэнняў, спалучыўшы ў сваім жыцці ўсе тры пералічаныя сферы дзейнасці чалавека. У дзяцінстве нароўні з матэматыкай яна захапляласяі літаратурай, на працягу трох гадоў займалася ў балетнай студыі ў Палацы піянераў.

Скончыўшы школу, Рэгіна вагалася, паступаць на фізмат або ў Літаратурны інстытут імя Горкага. Аднак для паступлення ў апошні былі патрэбны рэкамендацыі, якіх у яе на той момант не было. Так лёс падказаў дзяўчыне выбар, пра які яна ніколі не пашкадавала.

І ўсё ж душа прагнула творчасці. На трэцім курсе Рэгіна арганізавала харэаграфічны калектыў, які быў надзвычай запатрабаваны, выступаў на розных мерапрыемствах самадзейнасці і карыстаўся вялікай папулярнасцю. На адным з выступленняў Рэгіну Іосіфаўну заўважыў былы настаўнік балета і запрасіў яе займацца народным танцам. Амбітная дзяўчына жадала ахапіць усе сферы сваіх інтарэсаў, але праз рэпетыцыі яна была вымушаная прапускаць лекцыі, і аднойчы ёй зноў прыйшлося зрабіць выбар – і зноў на карысць матэматыкі.

Тым не менш Рэгіна Тышкевіч не развіталася з сваімі юнацкімі захапленнямі. Яна па-ранейшаму любіць літаратуру, асабліва паэзію Срэбнага стагоддзя. Сярод улюбёных аўтараў называе Блока, Ахматаву, Бродскага, вершы якога чытае на памяць з лёгкасцю і незвычайнай выразнасцю.

Музыцы Рэгіна Іосіфаўна аддае перавагу класічнай, любімыя яе кампазітары – Моцарт, Бах і Шапэн, прычым Моцарт найболей блізкі ёй па духу. Калі яна яшчэ была студэнткай, наведвала філармонію настолькі часта, што першы скрыпач з ёю раскланьваўся, а гардэробшчыца падавала паліто без чаргі. У той час ні адна прэм'ера ў Оперным тэатры не праходзіла міма яе. Зараз яна наведвае філармонію значна радзей, але збіраецца неўзабаве аднавіць паходы.

Як і Гесэ, Рэгіна Іосіфаўна заўважае падабенства паміж справай свайго жыцця і музычным мастацтвам: "У матэматыцы вельмі высокі ўзровень абстракцыі – гэтак жа, як і ў балеце, таму я лічу матэматыку найболей блізкай менавіта да балетнага мастацтва".

УНІВЕРСІТЭЦКІЯ БУДНІ

Рэгіна Тышкевіч з тых выкладчыкаў, успамін пра якіх студэнты праносяць праз усё жыццё. Адны ўзгадваюць жывую і захапляльную плынь яе лекцый, іншыя – выразнасць фармулёвак, іронію выказванняў, трэція – сумленнасць і справядлівасць у стаўленні да студэнта. Так, адна дзяўчына на іспыце ад хвалявання забылася важную тэарэму, але, тым не менш, здолела яе даказаць – і атрымала "выдатна". Для Рэгіны Іосіфаўны ўменне думаць значна важней за вызубраныя веды.

Любіць прадмет і любіць студэнта – вось універсальны рэцэпт адметнага выкладання ад Рэгіны Тышкевіч. "Інакш, – тлумачыць яна, – можа атрымацца добры прафесіянал, сумленны чалавек, які па стандартных праграмах падрыхтуе лекцыю і выпусціць стандартных спецыялістаў. Але гэтага недастаткова для таго, каб быць сапраўды добрым выкладчыкам".

"Люблю нават сваіх «хвасцістаў»", – прызнаецца Рэгіна Іосіфаўна. Успамінае студэнта, які выдатна іграў на акардэоне, але алгебру здаць не мог. Кожны вечар ён прыходзіў пад вокны да сваёй строгай выкладчыцы і спяваў "Рэгіна Іосіфаўна, пастаўце «тры»". "Навошта вам ставіць «тры»? – дзівілася яна, убачыўшыся з ім ва універсітэце. – вы выдатна спяваеце, я з задавальненнем слухаю вашы серэнады". Пры ўсёй любові да студэнта і мастацтва Рэгіна Іосіфаўна ацэньвае веданне матэматыкі, а не іншыя здольнасці.

Рэгіна Тышкевіч працуе ва універсітэце з 1956 года, і за гэты час мела справу з многімі пакаленнямі студэнтаў. На яе думку, узровень студэнтаў становіцца вышэйшым дзякуючы новым магчымасцям у падрыхтоўцы – шматлікія спецыялізаваныя школы, ліцэі, рэпетытары. У той жа час узровень сярэдняга студэнта падае. Рэгіна Іосіфаўна тлумачыць гэта зніжэннем якасці школьнай адукацыі.

ШЧАСЦЕ

Шчасце Рэгіна Іосіфаўна ўяўляе як дапытлівы даследчык. "Я забіраюся ў нетры абранага мной прадмета і не ведаю, як з іх выбрацца, мяне раздзірае цікаўнасць, – кажа яна. – Калі разумееш, што перад табой з'явіўся новы праход у глыбі навукі, шчыліна, у якую магчыма з цягам часу праціснуцца і пабачыць нешта новае, – гэта найвышэйшая ступень асалоды".

У кастрычніку адбылася матэматычная канферэнцыя ў гонар юбілею Рэгіны Тышкевіч: ёй споўнілася 80 гадоў. Сабралася больш за 100 чалавек з розных краін свету.

"Я думала, што прыедуць мае калегі з часоў Савецкага Саюза, – кажа Рэгіна Іосіфаўна. – Але прыехала шмат маладых людзей. Гэта сведчыць пра тое, што навука, якую мы цяпер робім, патрэбна іншым. Мае сябры прыехалі дзеля мяне, а маладыя людзі – дзеля маёй навукі. Большага шчасця не прыдумаеш".

Анастасія ШМІГЕЛЬСКАЯ

БЮЛЛЕТЕНЬ

УПРАВЛЕНИЯ ПО ДЕЛАМ КУЛЬТУРЫ БГУ

Исторический снимок. Юбиляры на сцене ДК Профсоюзов 16 декабря 2009 года.

«Калядны вянок» ПРИГЛАШАЕТ ВСЕХ 16 января на концерт Народной хоровой капеллы БГУ в «Белом зале» ДК Профсоюзов (пр. Независимости, 25, нач. в 18.00). **В дни школьных каникул детский ансамбль танца БГУ «Лятарыпка» выступит с концертами в лечебных учреждениях для онко- и гемобольных детей.**

За приглашениями на мероприятия «Калядны вянок» можно обращаться по адресу: пр. Независимости, 4, каб. 211, тел. для контактов: 209 54 69, www.culture.bsu.by

МЫ – СВОЕОБРАЗНЫЙ ЦЕНТР, КООРДИНИРУЮЩИЙ КУЛЬТУРНУЮ ЖИЗНЬ УНИВЕРСИТЕТА, ГДЕ КАЖДЫЙ МОЖЕТ НАЙТИ ПРИМЕНЕНИЕ СВОЕЙ ТВОРЧЕСКОЙ ЭНЕРГИИ И ТАЛАНТУ, А ГЛАВНОЕ – ДРУЗЕЙ-ЕДИНОМЫШЛЕННИКОВ, ОБЪЕДИНЕННЫХ ВЕЛИКОЙ СИЛОЙ ИСКУССТВА.

ОСОБЕННОСТИ СТУДЕНЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

На прошлой неделе на сцене ДК профсоюзов состоялся торжественный концерт в честь юбилея Управления по делам культуры БГУ. Это красочное действо снимали фотокорреспонденты и операторы республиканских СМИ. Словом, через сто лет историкам для изучения фактических материалов из культурной жизни БГУ будет достаточно! Но нам, увы, история не сохранила подобных фотодокументов восьмидесятилетней давности. Наш разговор с начальником Управления по делам культуры БГУ Владимиром Макаревичем начался как раз с этой темы.

– Насколько я знаю, история создания нашего управления берет свое начало от концертов молодежного клуба рабфака... В начале 20-х годов прошлого столетия повсеместно в молодой стране СССР организовывались агитационные кружки художественной самодеятельности. Помните, в старых кинолентах выступления агитбригад «Синие блузы»? Такие коллективы любительского творчества работали в разных жанрах: хор, танцевальный и кружок художественного чтения, сценические постановки на злобу дня. И без их участия праздники были просто невозможны. Управление по делам культуры, как самостоятельная структура, базировалось на энтузиазме таких агитбригад. Неофициальной точкой отсчета принято считать ноябрь 1924 года, когда был создан кружок белорусской культуры, которым руководил писатель, ученый Максим Иванович Гарецкий. А в 1929 году в честь юбилейной даты со дня рождения ВЛКСМ активистов самодеятельности перевели в полноправное подразделение университета. А коль скоро мы заговорили о знаковых событиях, то победоносный 1945 год связан с основанием четырех старейших(!) ныне народных коллективов БГУ: ансамбль танца «Крыжачок», оркестр народных инструментов, студенческий драматический театр и студенческая хоровая капелла.

– А существуют знаковые события в современной истории управления? События, к которым готовится особая культурная программа.

– Безусловно. И, возможно, я не буду оригинален и не оправдаю в очередной раз надежды поклонников модерна и андеграунда, если скажу, что день Победы – главное событие из всего перечня культурных мероприятий университета. Следующий год – событийный. И к 9 мая 2010 года, к 65-летию Победы над немецко-фашистскими захватчиками, мои коллеги уже сегодня готовят ряд проектов... Вот только, пожалуйста, не спрашивайте меня о конкретных элементах и эпизодах праздника!

– ?

– Плохая примета рассказывать о предстоящем мероприятии. Говорят, если хочешь насмешить Бога, то расскажи ему о своих планах. Я убежден, праздник Победы в Беларуси будет жить вечно, эта дата у соотечественников, если уместно такое определение, личная дата. Потому что, в каждой семье живут воспоминания о своем герое – участнике войны. И мне не понятны те политики, которые сегодня вдруг стали отдавать неадекватные приказы о сносе в Кутаиси мемориального памятника героям, погибшим в Великую Отечественную войну. Мне не понятны были и цели властей Таллинна в этом же контексте только несколько лет тому назад. Это плевок на подрастающее поколение! История и культура – это главные определения в семье для формирования менталитета и потребностей молодого человека – духовных, интеллектуальных и общечеловеческих.

Из детских воспоминаний мне особенно запомнились слова моей бабушки Евдокии, которая чтила все христианские заповеди, а после страшных военных испытаний стала добавлять и от себя одну тезу: «Дети, никогда не жалейте хлеба людям». Еще запомнил отца, который в один момент для меня, моих братьев и сестер, соседей в праздничный день 9 мая становился незнакомым Героем, чем-то похожим на персонажей из фильма «Белорусский вокзал». Каждый год моя большая и очень дружная семья по традиции провожали отца – бывшего фронтовика – в Слуцк. Собирали молча. В доме стояла звенящая тишина, как в минуту молчания. Мой отец был, как сейчас сказали бы, классический участник Великой Отечественной войны, а в те времена за бывшими фронтовиками из района обязательно присылали «Волгу»...и цветы. Тогда еще крепких и сильных духом Солдат Победы, привозили на торжественное заседание в райком. Сколько лет прошло, а атмосферу 9 мая в отцовском доме никому на Земле не удастся уничтожить. Мне врезалось в память это состояние на всю жизнь. Очень надеюсь, что у моих детей патриотические чувства привиты на генетическом уровне. Словом, беспамятства наши враги не дождутся!

Владимир МАКАРЕВИЧ, начальник Управления по делам культуры БГУ, Заслуженный деятель культуры РБ. Более 25 лет работает здесь и... сейчас.

– Белорусский государственный университет тоже славится своей особой атмосферой, особым «духом», что ли. Недаром же его называют «первым» среди вузов страны. Это обстоятельство каким-то образом влияет на поиск новых форм мероприятий вашего управления?

– Насчет особого духа в стенах университета, конечно же, вы правы. Иногда ловлю себя на том, что хочу «вычислить» студента БГУ среди участников какого-либо большого молодежного форума. И, представьте себе, мне это удается! Наш Студент – известная «торговая марка».

(Продолжение на стр.2)

ПОЗДРАВЛЕНИЯ ОТ НАШИХ ДРУЗЕЙ

Елена СПИРИДОВИЧ, заслуженная артистка Республики Беларусь:

– 80 лет – это тот возраст, когда можно подводить итоги и делиться опытом. 80 лет – это тот возраст, за которым стоят история и легенды. 80 лет – это тот возраст, когда можно не расставаться с мечтами и надеждами о том, что самое лучшее, яркое и красивое ждет впереди...

Чего я и желаю именинникам – всем сотрудникам Управления по делам культуры, которых искренне люблю.

Искуи АБАЛЯН, певица:

– Познакомились с Управлением по делам культуры БГУ мы еще в сентябре 1996г. Тогда я, еще будучи совсем "зеленой" артисткой, принимала участие в большом празднике, организованном на площади Независимости в г.Минске. Многотысячная аудитория первокурсников, особый ритуал посвящения их в студенты произвели на меня неизгладимое впечатление. Я была поражена профессионализмом организаторов мероприятия. Хочу отметить, что все творческие встречи, проводимые Управлением по делам культуры БГУ, отличаются особой теплой атмосферой, независимо от того, посвящены ли они Дню знаний, Дню матери, выпускной ли это бал или новогодняя вечеринка. Я и весь мой творческий коллектив поздравляем наших коллег с праздником и желаем творческих удач, бурных аплодисментов и теплых зрительских улыбок. Буду рада принять участие во всех ваших праздниках.



Евгении ЛАШКОВСКИЙ, телеведущий канала ОНТ:

– Бесконечно буду удивляться работоспособности коллектива Управления по делам культуры. Объем работ, которые они выполняют в университете, сравним, пожалуй, с программой мероприятий областного отдела культуры... Не сомневаюсь, что эти самодостаточные, креативные и красивые душой люди способны осилить новые, столичного уровня проекты. К слову, в широкомасштабной рекламе мероприятия БГУ уже не нуждаются, потому что творческие коллективы университета – «Неруш», «Крыжачок», «Галант», «На балконе», «Літарынка» – известные брэнды в Беларуси.

Хочу пожелать всему штатному коллективу управления в 2010 году стабильного и соответствующего их таланту финансирования. И, естественно, впечатляющих окладов каждому сотруднику. Потому что все то, что обычно желают юбилярам – у команды Владимира Макаревича в достатке. Потому что все мы понимаем, экономический кризис однажды пройдет, а культурная жизнь БГУ протекает здесь и сейчас.

С наступающим Новым годом!

Георгий КОЛДУН, телеведущий канала ОНТ:

– Я лишь хочу сказать, что, благодаря этим людям в жизни университета есть не только учеба. Пусть у них всегда хватает сил, нервов, здоровья на осуществление своих планов и идей. И самое важное, чтобы эти идеи не иссякли!

С Днем рождения!

Иван ВАБИЩЕВИЧ, певец:

– Всегда помню, что благодаря сотрудникам Управления по делам культуры БГУ – творческим и неординарным людям, я, можно сказать, состоялся как артист. Сейчас не верится, но несколько лет тому назад я выходил на сцену в спектаклях театра БГУ «На балконе». Замечательное было время! Благодарю всех, кто верил в меня, отдельное «спасибо» – модератору всех культурных проектов Владимиру Макаревичу и режиссеру Сергею Турбану.

Поздравляю всех сотрудников управления с юбилеем! И все же, несмотря на столь почтенный возраст – 80 лет, желаю новых креативных проектов в 2010 году. Главное – открывайте миру новые имена в искусстве. Ребята, вы обязательно справитесь!

Так держать!

СОБЫТИЕ ГОДА

В 2009 году на международный фестиваль «Тэатральны куфар» приехали 24 творческих коллектива из стран Европы и Америки. Театр БГУ «На балконе» был отмечен жюри и критиками, получил Гран-при и "Приз зрительских симпатий".

Сцена из спектакля "Зимы не будет".

ОСОБЕННОСТИ СТУДЕНЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

(Окончание. начало на стр.1)

У него особенный взгляд и осанка, несуетливое поведение среди сверстников... И, соответственно, марку необходимо держать и нам, труженикам корпоративной культуры.

– Корпоративная культура – это...

– ... это система отношений в группе единомышленников, их традиции и обычаи. Словом, все то, что объединяет здесь и сейчас абсолютно разных людей в одну команду. Меня можно упрекнуть, мол, заниматься корпоративной культурой в наше время очень модно. Но в условиях университета или любого другого учебного заведения – это не дань моде, а важная составляющая воспитательной деятельности! Во многих европейских вузах работают Центры студенческой культуры – бесценный потенциал формирования менталитета у молодых людей. Как известно, студенчество – одно из самых ярких времен нашей жизни. И, наверное, поэтому вузовские товарищи, мероприятия, сессии и преподаватели на всю жизнь оставляют след в нашей памяти. Признаюсь, и я, и мои коллеги в первую очередь считаем, что необходимо способствовать созданию благоприятной атмосферы в университете, формировать культурные традиции вуза. А это влечет за собой укрепление имиджа учебного заведения, позиционирование его как личностно-ориентированного университета XXI века. Студенческие годы, как я хорошо помню, не только лекции, семинары, зачёты и экзамены, это — время становления личности, время творчества, время определения главных эстетических ориентиров.

– Когда я училась в вузе, руководители чаще всего говорили нам напутствия, было время партийных достижений и свершений, что ли... Интеллигентское начало вырубалось на корню.

– Я не знаю точного определения «интеллигентный человек». Но мне запомнился ответ известного писателя Нодара Думбадзе: «Мой дед был безграмотным человеком, за свою жизнь не прочел ни одной книжки. Но даже в глубокой старости он всегда вставал с постели, чтобы поздороваться с ребенком, который зашел в наш дом. Интеллигент». Я надеюсь, студенты БГУ "по умолчанию" интеллигентные люди. Мне, вообще, хочется признаться им в уважении и любви.

Мне невероятно тяжело приходить на работу в дни каникул, когда в коридорах – ни души, стоит «убойная» тишина. Когда отсутствует знакомая мизансцена «человек, читающий конспект на быстром ходу». Честное слово, в такие дни чувствую себя бесконечно одиноким, как сталкер придуманный Стругацкими.

Очень хочется, чтобы коллективный труд сотрудников управления имел точный адрес, чтобы между нами и студентами существовала «живая» обратная связь в любом виде: электронное письмо на сайт, предложения в почтовом конверте. Поверьте, нам очень важно знать оценку проводимых мероприятий и конструктивные предложения на адрес будущих проектов. Пишите и заходите к нам!

– Звучит как пожелание...

– Скорее, как новое предложение, а пожелания перед Новым годом будут традиционными. Хочу пожелать студентам и сотрудникам БГУ в новом 2010 году здоровья и удачи!

Беседовала Жанна Васанская.

ПАРТНЁРЫ АКЦИИ "СВЯТА – ДЗЕЦЯМ":

ДАРИДА DARIDA

Компания "Дарида" сердечно поздравляет вас со светлыми праздниками Нового года и Рождества Христова! Крепкого здоровья, добра, счастья и благополучия, успехов в профессиональной деятельности искренне желаем вам и вашим близким.

Международное общественное благотворительное объединение «Независимая помощь детям» около 20 лет помогает детям Беларуси, осуществляя свою деятельность по 25 различным направлениям, среди которых особое внимание уделяется образовательным, социальным и оздоровительным проектам.

От всей души поздравляем Управление по делам культуры с прекрасным праздником, желаем всем здоровья, счастья и радости. С Новым 2010-м годом!

FANCY

Коллектив нашей компании от всей души поздравляет Управление по делам культуры Белорусского Государственного Университета, в лице начальника Управления Макаревича Владимира Михайловича,
с 80-летием!
Примите наши самые теплые слова и пожелания! Успехов и результатов в работе, удачи и неограниченных возможностей, здоровья, семейного благополучия и счастья!
Благодарим Вас за долгосрочное сотрудничество, неиссякаемое творчество и теплоту отношений Ваших сотрудников.
Пусть в жизни будет множество интересных и восхитительных событий, которые Вы организовываете с таким мастерством!
Мы создаем много игрушек разных игрушек -веселых сентиментальных, озорных. И объединяет их радость, которую мы дарим людям.
Мы гордимся тем, что нас стиль ценят наши партнеры.
Вместе мы сможем
Всего самого наилучшего!

ЮБІЛЕІ

Журналістыка спасцігаецца на практыцы

Інстытуту журналістыкі, які выпускае вельмі патрэбных для нашай краіны спецыялістаў, споўнілася 65 гадоў. Журналісты неабходныя, таму што кожны чалавек, фізік ён ці хімік, матэматык ці канструктар, урач ці юрыст, хоча заўсёды адчуваць увагу да сваёй асобы, прафесіі, дзейнасці. Многія лічаць, што ўмеюць пісаць яшчэ са школы. Аднак кожны навукоўца, кожны прафесіянал стараецца ў сваёй навуковай працы, справаздачы або кароценькім лісце да родных асэнсаваць вынікі ўласнай дзейнасці, падзяліцца цікавымі звесткамі з уласнага вопыту, увекавечыць свае погляды на рэчаіснасць. У сапраўднага ж журналіста стымулам для творчага натхнення становіцца любы іншы чалавек, з усімі яго схільнасцямі, дасягненнямі, памылкамі, узлётамі і падзеннямі. Можа, таму журналіст і ведае ўсё пра ўсіх, бо яму цікавыя розныя людзі з іх непаўторным светам. Назіраць, ацэньваць, рабіць высновы і іх "агучваць" – справа няпростая. І ёй трэба вучыцца. Пра гэта мы пагаварылі з дырэктарам Інстытута журналістыкі Сяргеем ДУБОВІКАМ, які падчас святкавання атрымаў з рук міністра адукацыі Аляксандра Радзькова ганаровы знак "Выдатнік адукацыі".

Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў уручае знак "Выдатнік адукацыі" дырэктару Інстытута журналістыкі Сяргею Дубовіку

– Сяргей Валянцінавіч, у гэтыя дні варта ўзгадаць гісторыю і тыя традыцыі, якія склаліся на факультэце журналістыкі.

– Адлік існавання факультэта журналістыкі мы пачынаем з 1944 г., калі 3 снежня ён быў пераўтвораны з аддзялення філалагічнага факультэта ў самастойную структуру. Дарэчы, такім шляхам ў 1946 г. узніклі і маскоўскі, і санкт-пецярбургскі, і кіеўскі журфакі. Як бачым, факультэт журналістыкі ў БДУ быў створаны нават першым у Савецкім Саюзе. А ў 1946 г. ён ужо сфарміраваў спецыяльную кафедру журналістыкі. За гады сваёй дзейнасці журфак падрыхтаваў 6 700 дыпламаваных спецыялістаў, якія паспяхова працуюць ва ўсіх сродках масавай інфармацыі Беларусі і ў шматлікіх замежных СМІ.

У межах юбілейнага тыдня мы адкрылі дзве імянныя аўдыторыі – прафесара Рыгора Булацкага і прафесара Барыса Стральцова. Калі чалавек пачынае будаваць дом, то спачатку закладвае фундамент. Дык вось, фундамент журналісцкай адукацыі заклалі людзі таго пакалення, якому належаць гэтыя два паважаныя выкладчыкі. І ўсе традыцыі факультэта і журналістыкі як спецыяльнасці паходзяць з тых часоў, калі на толькі што створаны журфак набралі першых 38 студэнтаў. З таго выпуску тры чалавекі прысвяцілі сваё жыццё факультэту – прафесар Ефрасіння Бондарава, прафесар Міхаіл Цікоцкі і дацэнт Ніна Сніцарава. І нават сістэма падрыхтоўкі кадраў, што ўсталявалася на журфаку, гэта хутчэй не шматлікія методыкі, а выкладчыкі, на вачах якіх развівалася і набірала моц журналісцкая прафесія, якія змаглі данесці многім пакаленням студэнтаў, што такое грамадзянская пазіцыя, асабістае меркаванне, аб'ектыўнасць, аператыўнасць, інфарматыўнасць і адказнасць перад чытачамі, слухачамі і гледачамі.

– Журналістыка – гэта прафесія, якая падсілкоўваецца сучаснымі падзеямі. Якія новаўвядзенні выкарыстоўвае інстытут, каб яна не страціла сваёй актуальнасці?

– Журналістыка развіваецца як ніводная іншая прафесія. Сёлета на першы курс мы набралі больш за 300 чалавек, тады як раней залічвалася 25 або 50 студэнтаў. І гэта, зразумела, патрабуе перабудовы ўсяго навучальнага працэсу. Сучасныя праблемы журналісцкай адукацыі шчыльна звязаны з новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі і з маштабнымі пераменамі, якія адбываюцца ў масавай камунікацыі. Рыхтаваць журналістаў, не ўлічваючы дынамічнага развіцця сферы масмедыя, яе імклівага тэхналагічнага абнаўлення, проста немагчыма. Тое, што было наватарскім 15 – 20 гадоў таму назад, сёння ўжо не адпавядае патрабаванням часу. І мы мусім браць да ўвагі ўсе новыя павевы ад глабальных тэндэнцый.

Доўгі час факультэт журналістыкі не меў уласнага будынка, які б адпавядаў вучэбным мэтам. Нарэшце летась журналісты перасяліліся ў новы корпус на Кальварыйскай, 9. Ён лепш прыстасаваны для падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у параўнанні з журфакамі іншых ВНУ краін СНД. Да нас часта прыязджаюць на міжнародныя канферэнцыі калегі з Расіі і Украіны, і яны заўсёды з захапленнем ходзяць па нашых аўдыторыях, прызнаюцца, што па-добраму зайздросцяць іх абсталяванню. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы беларускія журналісты пачынаюць асвойваць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ўжо з першага курса.

Сёлета мы зрабілі другі набор на новую спецыяльнасць "Вэб-журналістыка". Апошнім часам кожны са сродкаў масавай інфармацыі намагаецца мець уласныя інтэрнэт-версіі і сайты. Такая задача пастаўлена і ўсім раённым выданням. Таму, безумоўна, выпускнікі гэтай спецыяльнасці будуць карыстацца попытам на рынку працы.

Плануем адкрыць яшчэ адну спецыяльнасць – менеджмент СМІ. Усё часцей гучыць, што беларускія сродкі масавай інфармацыі, асабліва друкаваныя, павінны перайсці на самаакупнасць. Час дзяржаўных датацый заканчваецца, і важна развіваць камерцыйныя праекты, рэкламную дзейнасць і шукаць шляхі для выжывання. Месца працы менеджэраў СМІ – вытворчыя аддзелы мас-медыя, пасады намеснікаў рэдактара па эканоміцы, рэкламныя агенцтвы і г.д.

Зараз распрацоўваем неабходныя дакументы, вучэбную праграму, каб з наступнага года распачаць набор на спецыяльнасць "Літаратурная работа. Творчасць". Такім чынам, неўзабаве ў Інстытуце журналістыкі з'явяцца спецыялізацыі паэзіі, прозы, крытыкі, мастацкага перакладу і кінадраматургіі. Групы будуць невялікія: чалавек пяць на бюджэтным навучанні і столькі ж – на платным. На журфаку многія студэнты пішуць вершы і прозу. Таму гэтыя спецыялізацыі якраз для тых, хто імкнецца сумясціць журналістыку і ўласную творчасць.

– Выкладчыкі інстытута апошнім часам стараюцца данесці свае веды не толькі ўчарашнім школьнікам. За студэнцкія парты садзіцца ўсё больш уласна журналістаў...

– Факультэт журналістыкі быў рэарганізаваны ў інстытут з мэтай стварэння новай для яго сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. За мінулы год у нашым інстытуце сваю кваліфікацыю змаглі павысіць каля 600 журналістаў. Праца ў гэтым кірунку была высока ацэнена Міністэрствам інфармацыі. Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў узнік яшчэ ў адказ на запатрабаванні шматлікіх рэгіянальных СМІ, дзе супрацоўнікі часта не маюць спецыяльнай базавай адукацыі. Сёння ў іх з'явілася магчымасць прайсці двухгадовую завочную падрыхтоўку і атрымаць кваліфікацыю журналіста. Летась мы набралі першую групу каля 30 чалавек. Спадзяёмся, што пра гэтую праграму з цягам часу даведаецца яшчэ больш людзей і наступная група будзе значна большай. Сустрэць на нашым факультэце слухача, які ў два разы старэйшы за нашых студэнтаў, цяпер звычайная з'ява. Я лічу, што журналістыка – гэта тая прафесія, якой трэба вучыцца пастаянна. А пераемнасць пакаленняў ідзе толькі на карысць прафесіяналізму.

– Нашы выкладчыкі ўвесь час самастойна авалодваюць новымі методыкамі. На факультэце наладжаны вельмі цесныя сувязі з Інстытутам павышэння кваліфікацыі FOJO (Швецыя). На працягу пяці гадоў дацэнты і прафесары наведваюць навучальныя семінары ў Стакгольме і Кальмары па самых актуальных кірунках журналістыкі. Нашы шведскія партнёры таксама прыязджаюць да нас з лекцыямі. Вось і на гэты раз у нас шведскія спецыялісты праводзілі адукацыйны семінар "Культура і СМІ".

Асабіста я прыхільнік таго, каб кожны выкладчык журналістыкі абавязкова меў досвед працы ў сродках масавай інфармацыі. Магчыма, для прадстаўнікоў фундаментальных навук і важна абараніць кандыдацкую ці доктарскую дысертацыю, атрымаць навуковую ступень. У людзей жа творчай прафесіі, мастакоў, музыкантаў, журналістаў дысертацыя заключаецца крыху ў іншым: яны павінны быць майстрамі сваёй справы і служыць прыкладам для вучняў. Практык можа даць значна больш прафесійных ведаў для студэнта. Чыста журналісцкія прадметы нельга выкладаць, калі ты сам не журналіст. І мы прапаноўваем прафесіяналам, якія любяць працаваць з моладдзю, праводзіць заняткі на нашым факультэце. Практычна ўсе кіраўнікі беларускіх СМІ працуюць у Інстытуце журналістыкі па сумяшчальніцтве. Яны арганізоўваюць майстар-класы для студэнтаў і дзеляцца сваім вопытам працы ў газетах, на радыё, тэлебачанні. Спецыфіка прафесіі журналіста такая, што без практычнага аспекта нельга дабіцца пэўных вынікаў. І таму тэорыя павінна быць цесна пераплецена з практыкай.

– У Інстытут журналістыкі з кожным годам паступае ўсё больш і больш абітурыентаў. Ці апраўданы выпуск такой колькасці студэнтаў для нашай краіны?

– Калі б не было апраўдана, мы б гэтым не займаліся. Выпускнікі бюджэтнай формы навучання размяркоўваюцца звычайна ў дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Выпускнікі, якія займаліся на платнай форме навучання і маюць права самастойнага працаўладкавання, таксама хутка і без праблем знаходзяць сабе месца працы. У Беларусі з кожным днём узнікае ўсё больш і больш інфармацыйных структур, якім патрэбныя журналісты. Акрамя гэтага, нашы выпускнікі ўладкоўваюцца ў органы дзяржкіравання, а таксама ў ідэалагічныя аддзелы райвыканкамаў. Сёння спецыялісты ў галіне камунікацыі і распаўсюджвання інфармацыі высока цэняцца працадаўцамі.

Ганна ЛАГУН
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СВЯТА ІНСТЫТУТА ЖУРНАЛІСТЫКІ

Юбілейныя мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю стварэння факультэта журналістыкі БДУ, прайшлі з 30 лістапада па 5 снежня.

Святкаванне пачалося з адкрыцця імянных аўдыторый прафесара Барыса Стральцова і прафесара Рыгора Булацкага. Рыгор Булацкі з'яўляецца стваральнікам журналісцкай адукацыі на Беларусі і адным з арганізатараў журналісцкай адукацыі ў СССР. Барыс Стральцоў вядомы ўсёй краіне як тэарэтык і практык журналістыкі, аўтар кніг, эсэ і манаграфій. Многія пакаленні прафесійных журналістаў Беларусі лічаць яго настаўнікам з вялікай літары. У гэтыя ж дні прайшла прэзентацыя кнігі "Урок моўнага майстэрства" доктара філалагічных навук прафесара Міхаіла Цікоцкага.

У межах праграмы святкаванняў была праведзена XI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Журналістыка-2009". На яе пленарным пасяджэнні былі ўручаны дыпломы "Ганаровы прафесар Інстытута журналістыкі БДУ" рэдактару "СБ-Беларусь сегодня" Паўлу Якубовічу і старшыні праўлення ЗАТ "Другі нацыянальны тэлеканал" Рыгору Кісялю.

Сярод усіх мерапрыемстваў вылучаўся семінар "Культура і СМІ", які зладзіў для беларускіх калег Інстытут павышэння кваліфікацыі FOJO (Швецыя). Цікавымі мерапрыемствамі былі круглы стол "Сацыялогія дзіцячай і юнацкай прэсы", фестываль студэнцкіх відэаработ "Аб'ектыўны ракурс", вечар студэнцкай літаратурнай творчасці "Народзіны журфака" і цырымонія ўзнагароджання выкладчыкаў "Залатая качка".

Падрыхтоўка журналісцкіх кадраў ва універсітэце пачалася ў лістападзе 1944 г. Факультэт журналістыкі быў пераўтвораны ў Інстытут журналістыкі БДУ 1 верасня 2008 г. Сёння тут навучаецца 1 566 студэнтаў (у тым ліку 1 000 на дзённым і 467 – на завочным аддзяленнях, 70 замежных студэнтаў, 29 слухачоў па праграме перападрыхтоўкі). Навучанне вядзецца па спецыяльнасцях "Міжнародная журналістыка", "Літаратурная работа (рэдагаванне)", "Інфармацыя і камунікацыя (тэхналогіі камунікацыі)", а таксама па трох напрамках спецыяльнасці "Журналістыка": друкаваныя СМІ, аўдыёвізуальная журналістыка, вэб-журналістыка. Спецыяльнасць перападрыхтоўкі – "Сродкі масавай інфармацыі".

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

ВЯЛІКАЯ ГУЛЬНЯ Ў БІЗНЕС

Каманда Young Pros эканамічнага факультэта БДУ стала пераможцам Нацыянальнага фіналу GMC-Student Belarus 2009.

Сучасная сусветная эканамічная сітуацыя патрабуе новых падыходаў да падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў. Адным з іх з'яўляецца інавацыйны адукацыйны праект, які рэалізуецца з 2008 г. у Беларусі, – спаборніцтвы па стратэгічным менеджменце Global Management Challenge (GMC, http://www.gmc-student-by.org/). У гэтых найбуйнейшых у свеце спаборніцтвах ужо больш за 30 гадоў мераюцца сіламі менеджэры шматлікіх краін.

GMC дае магчымасць бізнес-навучання ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных. Ён дазваляе ўдзельнікам зразумець працу розных бізнес-падраздзяленняў кампаніі як адзінага цэлага. Адбываецца апрабацыя нестандартных рашэнняў, новых стратэгій развіцця без фінансавых рызык для кампаніі.

У аснове спаборніцтва GMC знаходзіцца комплексны кампутарны сімулятар (business simulation), які імітуе працэс кіравання кампаніяй ва ўмовах глабальнай канкурэнцыі. Каманды менеджэраў (3-5 чалавек), прымаючы больш за 60 стратэгічных рашэнняў кожны тыдзень, намагаюцца забяспечыць найвышэйшы кошт акцый сваёй кампаніі ў прамой канкурэнцыі з іншымі камандамі ў сваёй групе.

У праекце GMC-Belarus 2009 удзельнічалі 52 каманды, якія прадстаўлялі дзейных менеджэраў вядучых беларускіх кампаній, а таксама студэнтаў старэйшых курсаў ВНУ.

Галоўная інтрыга студэнцкага фіналу складалася ў тым, ці здолее каманда Economicus (эканамічны факультэт БДУ), якая лідзіравала ў папярэдніх турах, атрымаць канчатковую перамогу. На працягу 5 гульнявых перыядаў ішла ўпартая барацьба. Каманды прынялі апошнія рашэнні і цэлы дзень з нецярпеннем чакалі канчатковых вынікаў.

3 снежня быў абвешчаны пераможца Нацыянальнага фіналу GMC-Student Belarus 2009 – ім сенсацыйна стала каманда Young Pros. У апошнім перыядзе ў яе атрымалася ажыццявіць сур'ёзны рывок і стаць адзінай камандай, якая павялічыла кошт кампаніі ў параўнанні з першапачатковым становішчам ва ўмовах фінансавага крызісу і ўпадку рынку. Яе складалі: Юлія Баранава, Дар'я Дзяміда, Сяргей Ісаеў і Ірына Янушкевіч. У агульным заліку сярод 8 камандаў лідарства эканамічнага факультэта БДУ бясспрэчнае: Young Pros (БДУ) – 1.186 акцый, Economicus (БДУ) – 1.162, PrimeNumbers (зборная каманда БДЭУ і Акадэміі кіравання) – 1.154, DOLCE VITA (зборная каманда ІБМТ БДУ, БНТУ) – 1.125, "Каманда на экспарт" (эканамічны факультэт БДУ) – 1.120.

Пераможца GMC-Belarus 2009 сярод менеджэраў – каманда БТК (Белтэлекам) – будзе прадстаўляць краіну на Міжнародным фінале GMC у 2010 г. у Расіі. Яшчэ пяць камандаўудзельніц GMC былі ўзнагароджаныя прэміямі "Global Award 2009", з іх перамогу ў намінацыі "Лідар продажаў" атрымала "Альтэрнатыўная эканоміка" (эканамічны факультэт БДУ).

У 2008 г. пераможцам турніру стала каманда эканамічнага факультэта БДУ "Новая ініцыятыва". На Міжнародным фінале GMC, які праходзіў у Лісабоне, яна выйшла ў фінал і заняла 6-е месца сярод найлепшых камандаў менеджэраў з 30 краін свету.

Запрашаем усіх студэнтаў старэйшых курсаў прыняць удзел у спаборніцтвах GMC у наступных сезонах і працягнуць пераможную традыцыю альма-матэр.

Аляксандр ШАШКО,
эксперт GMC-Belarus

ВЕДАЙ НАШЫХ!

22 снежня ўрачыста былі падведзеныя вынікі спартыўнага года ў БДУ і адбылося ўзнагароджанне найлепшых студэнтаў-спартсменаў і камандаў.

Пераможцам круглагадовай спартакіяды стала каманда юрыдычнага факультэта; 2 месца ў геаграфічнага факультэта і 3 месца ў механіка-матэматычнага факультэта. Найлепшым трэнерам-арганізатарам 2009 г. абвешчаны старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Віктар Кавалёў, найлепшым трэнерам-выкладчыкам – старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Мікалай Прусаў.

У намінацыі "Найлепшы спартсмен БДУ" віншаванні прымалі: студэнтка 2 курса ФФСН Таццяна Каляда (чэмпіёнка Беларусі па лыжных гонках); студэнт 4 курса юрфака бронзавы прызёр чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе Аляксандр Кікенеў; студэнтка 4 курса юрфака бронзавы прызёр чэмпіянату свету па армрэстлінгу Ганна Савеня і студэнт 3 курса эканамфака бронзавы прызёр чэмпіянату свету па армрэстлінгу Дзяніс Савеня.

Акрамя таго, памятнымі падарункамі былі ўзнагароджаныя студэнты БДУ – ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў у Пекіне: бронзавы прызёр па грэка-рымскай барацьбе Міхаіл Сямёнаў (5 курс гістфака); бронзавы прызёр па мастацкай гімнастыцы Ксенія Санковіч (1 курс юрфака); а таксама лёгкаатлетка Марына Новік (5 курс эканамфака), барэц Аляксандр Кікенеў (4 курс юрфака) і плывец – Станіслаў Невяроўскі (5 курс юрфака).

Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел кіраўніцтва ВНУ, прафсаюзных камітэтаў студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. І, вядома, спартсменаў прывіталі артысты, танцавальныя калектывы, з паказальнымі нумарамі выступілі універсітэцкія зборныя па аэробіцы і каратэ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВІКТАРЫНА

Падведзены вынікі студэнцкай віктарыны "Папараць кветка зацвітае для цябе ў БДУ", якая праводзілася ў кастрычніку-лістападзе ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю сумесна з рэдакцыяй газеты "Універсітэт". Камісія на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімірам Суворавым вырашыла:

ПРЫСУДЗІЦЬ:
I месца – *Антону ДАНІЛАВУ* (2 курс эканамічнага факультэта),
II месца – *Таццяне ТАМАШЭВІЧ* (5 курс ДІКСТ),
III месца – *Паўлу ШАЛАМІЦКАМУ* (4 курс фізічнага факультэта);

ПРЫЗНАЦЬ ЛАЎРЭАТАМІ:
Вікторыю БАРАШЭНКУ (1 курс філалагічнага факультэта);
Ларысу ЧУДАЕВУ і *Святлану ГАЛУШКУ*
(абедзве –1 курс філалагічнага факультэта);
Дар'ю МАТВІЕНКУ (1 курс філалагічнага факультэта);
Алену СКОПІНАВУ (3 курс гуманітарнага факультэта);
Інэсу СЫС (1 курс юрыдычнага факультэта).

Прэмія за I месца вылучана ў памеры 350 тыс. руб., за II месца – 250 тыс. руб., за III месца – 150 тыс. руб. Лаўрэаты атрымалі па 80 тыс. руб.

Аддзел моладзевых праграм і праектаў УВРМ

НАШЫ ГОСЦІ

У жыцці кожнага чалавека бываюць такія падзеі, якія надоўга пакідаюць след у сэрцы, пра якія хочацца распавесці сябрам. Менавіта такая запамінальная сустрэча адбылася на геаграфічным факультэце са знакамітым беларускім паэтам Уладзімірам КАРЫЗНАМ. Яна была арганізавана дзякуючы супрацоўнікам аддзела гуманітарна-асветніцкай работы Фундаментальнай бібліятэкі БДУ і выкладчыцы з філалагічнага факультэта Людміле Хрышчановіч.

Сустрэча, якая застаецца ў памяці

Яшчэ да пачатку сустрэчы супрацоўнікі бібліятэкі прынеслі і хораша афармілі кніжную выставу. І мы мелі магчымасць не толькі ўбачыць, але і патрымаць у руках, пагартаць шматлікія зборнікі паэта. Гучала музыка, што стварала святочны настрой. Насамрэч гэта было сапраўднае свята паэзіі, напоўненае шчырасцю, дабрынёй і любоўю да роднай Беларусі. Якія былі адухоўленыя твары маіх аднакурснікаў, калі яны натхнёна чыталі вершы паэта! А калі выйшлі студэнты шостай групы Андрэй Багамолаў і Сяргей Шаўцоў і заспявалі вядомую беларускую песню "Люблю цябе, Белая Русь", аўтарам слоў якой з'яўляецца Уладзімір Іванавіч, то можна сабе толькі ўявіць, як бурна рэагавала зала.

Паэт расказаў нам пра свой творчы шлях, прачытаў любімыя вершы, адказаў на шматлікія пытанні аўдыторыі. Панавала атмасфера душэўнай цеплыні і прыязнасці. Нам было прыемна пачуць добрыя словы нашага паважанага госця ў адрас геаграфічнага факультэта, які мы любім, і ганарымся, што з'яўляемся яго студэнтамі. На гэтай сустрэчы прысутнічалі не толькі студэнты, але і выкладчыкі, а таксама дэкан прафесар Іван Пірожнік. Яны разам з намі спявалі Дзяржаўны гімн Беларусі, аўтарам тэксту якога з'яўляецца Уладзімір Карызна.

Думаю, што не толькі ў мяне, але і ва ўсіх прысутных было адчуванне адной вялікай дружнай сям'і, што напаўняла сэрца гордасцю.

Кацярына СЛАБКО
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ФЕСТЫВАЛІ



Рэспубліканскі фестываль творчасці замежных студэнтаў "F.-ART.by", арганізаваны Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Беларусі, праходзіў у Мінску з 17 лістапада па 14 снежня. У ім прымалі ўдзел замежныя студэнты практычна ўсіх ВНУ краіны. Беларускі дзяржаўны універсітэт на гэтым фестывалі быў прадстаўлены факультэтам дауніверсітэцкай адукацыі.

Праграма падрыхтоўкі ўдзельнікаў фестывалю на ФДА ўключала інтэрактыўныя лінгвакраіназнаўчыя мерапрыемствы, арганізаваныя кураторамі ў кожнай акадэмічнай групе. Праз з іх замежныя слухачы знаёміліся з культурай беларускага народа, фальклорам Беларусі, з вялікім натхненнем і задавальненнем распавядалі пра сваю радзіму, новых сяброў і выкладчыкаў, выконвалі танцы і песні сваіх краін. Найлепшыя студэнцкія нумары былі паказаны ў канцэртных праграмах адкрыцця і закрыцця Рэспубліканскага фестывалю.

Самым яркім мерапрыемствам стала праведзеная факультэтам дауніверсітэцкай адукацыі вечар-акцыя "Давайце пазнаёмімся!" пры творчым удзеле 52 слухачоў ФДА, якая выклікала вялізную цікавасць і захапленне нават у самых строгіх членаў журы.

Нікога не пакінуў абыякавым палымяны джайв у выкананні Мішэль і Джона-Палі Монхе з Эквадора. А разам са студэнткамі з Нігерыі Памэлай і Мірандай Ікірыка танчыла ўся зала! Неспадзеўкай для гледачоў сталі вершы Якуба Коласа, якія на беларускай мове прачытала Цзінь Цзянь. Цудоўна спявалі па-руску кітайскія студэнты Біліке Саймайці і Цянь Іцюнь, Сунь І. Арыгінальны кітайскі народны танец выканала зграбная і грацыёзная Чжао Жуймэй. А Ду Жуйцын і Цюй Хао падрыхтавалі кампазіцыю з элементамі кітайскіх баявых мастацтваў "Півоня, якая распускаецца". Самай высокай хвалы заслугоўваюць і выступы беларускіх студэнтаў факультэта.

І цалкам заслужана прадстаўнікі Міністэрства адукацыі ўручылі дыплом лаўрэата фестывалю факультэту дауніверсітэцкай адукацыі БДУ, які падрыхтаваў яркую і маляўнічую праграму і перамог у намінацыі "Найлепшае тэматычнае мерапрыемства", а студэнты ФДА атрымалі медалі, дыпломы і падарункі.

Гэта пілотнае мерапрыемства замежных слухачоў факультэта дауніверсітэцкай адукацыі, якія робяць першыя крокі па нялёгкай дарозе ў вывучэнні рускай мовы. Вечар-акцыя "Давайце пазнаёмімся!" распачынае цыкл лінгвакраіназнаўчых мерапрыемстваў, якія традыцыйна праводзяцца на ФДА на працягу года і дапамагаюць замежным студэнтам акунуцца ў факультэцкі свет, дзе славіцца веданне, культура і талерантнасць.

Г. ВАРЫЧЭНКА, В. ДАБРЫЯН,
каардынатары выхаваўчай працы
з замежнымі слухачамі ФДА

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

Двухдзённы навукова-практычны семінар "Інтэграваныя формы навучання ў галіне фундаментальнай хіміі" прайшоў 3-4 снежня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Арганізатарамі яго сумесна з БДУ выступілі Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Маскоўскае бюро Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

У адкрыцці мерапрыемства прымалі ўдзел старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, прарэктар па навуковай працы БДУ акадэмік Алег Івашкевіч, загадчык кафедры двайнога падпарадкавання агульнай і неарганічнай хіміі БДУ і НАН Беларусі, загадчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі БДУ акадэмік Анатоль Лесніковіч, дэкан хімічнага факультэта БДУ прафесар Уладзімір Панькоў.

У рамках семінара працавалі дзве секцыі: "Праблемы інтэграцыі навукі і адукацыі", "Фарміраванне інтэграваных формаў навучання ў фундаментальнай хіміі". Разглядаліся пытанні, якія тычацца ўдасканалення метадаў навучання хімічным навукам студэнтаў і аспірантаў у адпаведнасці з патрабаваннямі інавацыйнай адукацыйнай палітыкі дзяржавы і еўрапейскімі тэндэнцыямі, а таксама захады па далучэнні беларускіх спецыялістаў-хімікаў да грамадскага, адукацыйнага і навуковага працэсу. У дыскусіі ўдзельнічалі навукоўцы НАН Беларусі, БДУ, БДТУ, БДПА, БДУІР і рэгіянальных вышэйшых навучальных устаноў.

У выніку прыняты дакумент з прапановамі па стварэнні нарматыўнай прававой базы інтэграванага навучання.

Акрамя таго, правядзенне гэтага семінара напярэдадні Года хіміі, які будзе адзначацца па ініцыятыве ЮНЕСКА ў 2011 г., стала ўкладам у рэалізацыю адной з галоўных праграм ЮНЕСКА па падтрымцы тэхналагічнай і інавацыйнай навукі для яе ўстойлівага развіцця і павышэння ролі фундаментальных навук.

На юрыдычным факультэце БДУ 8 снежня адбылася дзесятая Міжуніверсітэцкая студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 61 гадавіне прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

Правядзенне канферэнцый і круглых сталоў, прысвечаных Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, стала на юрыдычным факультэце традыцыяй. Ініцыятарам гэтых мерапрыемстваў з'яўляецца дацэнт кафедры канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права Ала Шаўцова. З шэрага кафедральных дадзеная канферэнцыя вырасла да ўзроўню міжуніверсітэцкай: у ёй прымалі ўдзел больш як 100 студэнтаў, у тым ліку студэнты сталічных ВНУ: Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Акадэміі МУС, Прыватнага інстытута кіравання і прадпрымальніцтва.

На пленарным пасяджэнні выступілі Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч, афіцыйны прадстаўнік ААН у нашай краіне Антоніус Брук, намеснік міністра юстыцыі Беларусі Ала Бадак, старшыня Пастаяннага савета камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Яўген Смірноў, а таксама дэкан юрыдычнага факультэта прафесар Сяргей Балашэнка.

Галоўнай мэтай канферэнцыі з'яўляецца фарміраванне гуманістычнага светаўспрымання, пачуцця грамадзянскай адказнасці, глыбокага разумення асноўнага зместу правоў, свабод і абавязкаў; садзейнічанне здабыццю студэнтамі ведаў аб сістэме правоў чалавека, замацаваных у міжнародных стандартах, рэгіянальных нормах права, нацыянальным заканадаўстве Беларусі, а таксама інфармаванне аб асаблівасцях абароны правоў чалавека на універсальным міжнародным узроўні спецыялізаванымі рэгіянальнымі інстытутамі і грамадскімі праваабарончымі арганізацыямі і сістэмай дзяржаўных органаў.

Студэнты прадэманстравалі высокую актыўнасць, вялікі творчы патэнцыял, выказвалі наватарскія рашэнні прававых праблем, а таксама прапановы па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства і механізму абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

Вада, змена клімату і здароўе чалавека



Міжнароднае супрацоўніцтва адносіцца да прыярытэтных кірункаў дзейнасці хімічнага факультэта. Нароўні з ажыццяўленнем навуковых даследаванняў сумесна з замежнымі універсітэтамі і навуковымі цэнтрамі развіваецца партнёрства з міжнароднымі арганізацыямі з мэтай правядзення навуковых і навукова-адукацыйных мерапрыемстваў. Яркім прыкладам такой дзейнасці стаў Міжнародны моладзевы форум "Вада, змена клімату і здароўе чалавека", які прайшоў у БДУ 25-26 лістапада і быў арганізаваны пры садзейнічанні ўплывовай міжнароднай арганізацыі "Цэнтральная Еўрапейская Ініцыятыва" ў рамках праграмы "CEI Cooperation Fund". Мерапрыемства было падтрымана і іншымі даўнімі партнёрамі факультэта, у тым ліку Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі і Праграмай "Балтыйскі універсітэт", а таксама дзяржструктурамі – Міністэрствам замежных спраў, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў, ДКНТ, НДІ фізіка-хімічных праблем. Цікавасць да форума выявілі беларускія прадпрыемствы СТАА "Дарыда", УП "Мінскводаканал", а таксама кампанія "Filter".

Ключавая задача форума – павышэнне інфармаванасці маладога пакалення па пытаннях забруджвання і аховы водных рэсурсаў, наступстваў змены клімату і захавання ў гэтых найскладанейшых умовах здароўя чалавека. На адкрыцці мерапрыемства выступілі першы прарэктар БДУ М. Жураўкоў, Старшыня ДКНТ І. Войтаў, пасол па спецыяльных даручэннях МЗС РБ, Старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА У. Шчасны, дарадца Галоўнага ўпраўлення Еўропы МЗС РБ А. Кожан, прадстаўнік ААН у Беларусі сп. А. Брук, дэкан хімічнага факультэта У. Панькоў.

З навуковымі дакладамі выступілі вядучыя спецыялісты з Беларусі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Германіі, Латвіі: акадэмікі НАН Беларусі І. Ліштван і У. Логінаў, акадэмік НАН Украіны У. Ганчарук, член-карэспандэнт НАН Беларусі А. Кудзельскі, прафесар Д. Грышпан, протаіерэй Беларускай праваслаўнай царквы У. Быстракоў, дацэнт Т. Савіцкая, прарэктар Тэхнічнага універсітэта Лодзі прафесар І. Збісінскі, старшыня Савета па рэгістрацыі еўрапейскіх хімікаў прафесар П. Драшар, прафесар Карлава універсітэта ў Празе Ю. Барэк і іншыя. Асаблівасцю форума з'явіліся выступы з навуковымі дакладамі маладых спецыялістаў і студэнтаў з розных універсітэтаў і арганізацый.

Удзельнікі форума сышліся ў меркаванні, што сучасны стан водных рэсурсаў і глабальны характар змены клімату дыктуюць неабходнасць пошуку шляхоў рашэння гэтых праблем на міжнародным узроўні. Разам з тым дзейнасць па змякчэнні наступстваў кліматычных змен і рацыянальным водакарыстанні варта пачынаць на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях, аб'ядноўваючы высілкі навукі, адукацыі, грамадскасці і ўрада. Форум паслужыў пачаткам канструктыўнай гутаркі пра гэта паміж моладдзю і прадстаўнікамі старэйшага пакалення. Арганізатары не збіраюцца спыняцца на дасягнутым. Новых ідэй і планаў ужо сёння дастаткова. Працяг будзе...

Таццяна САВІЦКАЯ,
намеснік дэкана хімічнага факультэта па навуковай рабоце

ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ
ФАКУЛЬТЭТ
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА ЭКСКУРСАВОДАЎ І МЕНЕДЖЭРАЎ ТУРЫЗМУ»
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ 4, 5 КУРСАЎ
НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ
"Менеджмент турысцкай арганізацыі"
(завочная форма навучання – 21 месяц, вочная (вячэрняя) формы навучэння – 18 месяцаў)
Навучанне платнае.
Залічэнне па выніках сумоўя.
Па заканчэнні навучання выдаецца дыплом аб перападрыхтоўцы дзяржаўнага ўзору на ўзроўні вышэйшай адукацыі з прысваенням кваліфікацыі "Менеджэр".
Тэл./факс: 209-59-71; (029) 133-50-16.
www.imo.bsu.by

ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ
ЗАПРАШАЕ СТУДЭНТАЎ 4, 5 КУРСАЎ І МАГІСТРАТУРЫ, СПЕЦЫЯЛІСТАЎ З НЯПРОФІЛЬНАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ
на перападрыхтоўку па спецыяльнасці "Сродкі масавай інфармацыі"
(2 гады завочнай формы навучання)
Навучанне платнае.
Залічэнне па выніках сумоўя.
Па заканчэнні навучання выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору з прысваенням кваліфікацыі "Журналіст"
Дакументы прымаюцца да 20.01. 2010 г.
Тэл./факс: 259-70-16, 259-70-72
http://www.journ.bsu.by
e-mail: jorn_fpk@bsu.by

ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ
ФАКУЛЬТЭТ
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА ЭКСКУРСАВОДАЎ І МЕНЕДЖЭРАЎ ТУРЫЗМУ»
ЗАПРАШАЕ СТУДЭНТАЎ 4, 5 КУРСАЎ
НА КУРСЫ ЭКСКУРСАВОДАЎ
па праграме, узгодненай з Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь
Тэрмін навучання – 5 месяцаў.
Навучанне платнае.
Залічэнне па выніках сумоўя.
Па заканчэнні слухачы атрымліваюць пакет дакументаў і навыкі па чатырох напрамках (экскурсіі па Мінску, у Хатынь, на Курган Славы, у Мір і Нясвіж). Выдаецца пасведчанне экскурсавода.
Тэл./факс: 209-59-71;
(029) 133-50-16; (029) 269-69-72.
www.imo.bsu.by

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

З пачатку бягучага года выдадзена 303 і чакаюць сваёй чаргі ў друкарні 40 кніг і брашур.

Прапануем увазе чытачоў некаторыя з выданняў, якія нядаўна пабачылі свет.

Уладыкоўская Л.М. Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізму.

Манаграфія прысвечана праблеме духоўных асноў быцця і іх выяўленню ў беларускай культуры з улікам сацыякультурных трансфармацый сучаснасці. Раскрываецца праблема разнастайнага ўплыву глабалізацыйных тэндэнцый на характар развіцця нацыянальнай культуры.

Романов О.Г., Толстик А.Л. Пространственно-временные структуры световых полей в нелинейных интерферометрах.

Выкладзена тэорыя фарміравання прасторава-часавых структур светлавых палёў у інтэрферометрах с кераўскай, рэзананснай і цеплавой нелінейнасцямі.

Лебединский С.И. Восприятие устной научной речи: стратегии понимания смысловой информации на уровне микро- и макротекстов.

Манаграфія прысвечана адной з актуальных праблем сучаснай тэарэтычнай і прыкладной псіхалінгвістыкі праблеме ўспрымання і разумення вуснага навуковага маўлення.

Некрашэвіч-Кароткая Ж.В. Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс.

Кніга прысвечана даследаванню літаратурнай творчасці пачынальнікаў беларускай лацінамоўнай паэзіі Яна Вісліцкага і Мікалая Гусоўскага. У кнізе змешчаны малавядомыя паэтычныя творы Мікалая Гусоўскага ў перакладзе на беларускую мову, а таксама ілюстрацыйны матэрыял, які дапаўняе тэкставую частку манаграфіі.

Мартынов В.В. В центре сознания человека.

Манаграфія з'яўляецца выніковай працай аўтара і ўключае яго даследаванні ў розных галінах лінгвістыкі (этымалогія, гістарычная семантыка, славяна-неславянскія кантакты) і штучнага інтэлекту, а таксама ўзор мастацкай прозы.

Комаровский М.Е. Палеоложбины Белорусского Поозерья.

У манаграфіі прыводзяцца вынікі комплексных даследаванняў і матэрыял па будове і фарміраванні палеалагчын Беларускага Паазер'я.

Алешка Т.В. Русская литература первой половины XX века. 1920 1950-е годы.

У дапаможніку разглядаюцца асаблівасці развіцця рускай літаратуры першай паловы XX ст. (1920-1950-я гады), даецца агляд кожнага перыяду, раскрываюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця паэзіі і прозы. Асаблівая ўвага надаецца пісьменнікам, творы якіх складаюць класіку рускай літаратуры (М. Горкі, М. Булгакаў, С. Ясенін, У. Маякоўскі і інш.).

Регулирование и саморегулирование СМИ на постсоветском пространстве.

У кнігу ўключаны артыкулы ўдзельнікаў семінара Міжнароднай летняй школы па медыяправе для выкладчыкаў факультэтаў і аддзяленняў журналістыкі ВНУ Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Малдовы і Расіі, які праводзіўся ў БДУ 25-27 мая 2009 г. пры падтрымцы Бюро ЮНЕСКА ў Маскве.

Память и слава: Гилер Маркович Лившиц. К 100-летию со дня рождения.

Кніга прысвечана навуковай і педагагічнай дзейнасці Г.М. Ліўшыца, прафесара, доктара гістарычных навук, аднаго з першых даследчыкаў кумранскіх рукапісаў, навукоўцы з сусветным імем.

Филологические штудии = Studia philologica.

У сёмым выпуску зборніка "Філалагічныя штудыі" прапанаваны артыкулы, прысвечаныя праблемам класічнай філалогіі, рэцэпцыі антычнай культуры ў еўрапейскую, грэка-лацінскай тэрміналогіі, даюцца пераклады лацінскіх тэкстаў на беларускую мову.

Буза М.К. Системы параллельного действия.

Разглядаюцца структуры і функцыянаванне шматпрацэсарных сістэм, а таксама мовы апісання паралельных алгарытмаў, метады планавання і сінхранізацыі паралельных працэсаў, якія ўзаемадзейнічаюць, і сціскання інфармацыі.

Слука А. Г. Беларуская журналістыка.

На аснове гістарычна-аб'ектыўнай метадалогіі даследаваны працэс развіцця і функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі ў перыяд з 1941 па 2005 г. Паказана эвалюцыя нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ад камуністычнай ідэалогіі ў БССР да дэмакратычнай сістэмы камунікацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Бурко Л. Д. Систематика хордовых животных.

У дапаможніку прыводзіцца інфармацыя пра асаблівасці біялогіі, марфалогіі і колькасны склад асноўных сістэматычных груп хордавых жывёл.

Безнюк Д. К. Социология религии.

У дапаможніку разглядаюцца асноўныя тэарэтычныя і прыкладныя праблемы сацыялогіі рэлігіі як асобнай галіны сацыягуманітарных ведаў. Асаблівая ўвага надаецца аналізу сучаснай рэлігійнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы

УНІВЕРСІТЭТ

28 снежня 2009 года, № 22-23 (2015-2016)

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Рок-фестываль БДУ "Такія пернікі" 14 і 15 снежня прайшоў у клубе "Акварыум".

Такія пернікі



Больш за 30 маладых рок-груп падавалі заяўкі на ўдзел, але толькі 12 найлепшых прайшлі ў асноўны тур. Кампетэнтнае журы, у складзе якога: нязменны лідар групы "Палац" Алег Хаменка, маладыя, але ўжо папулярныя рокеры, якія ў свой час таксама прайшлі "Такія пернікі", – браты Каракіны, прадзюсар і кампазітар Леанід Шырын, спявак і музыка Андрэй Маркуц, а таксама начальнік упраўлення культуры Маскоўскага раёна Андрэй Бялоў і пачынальніца праекта "Такія пернікі" Аксана Чупрына.

Новы фармат правядзення дазволіў удзельнікам груп пачуць усё, што думаюць пра іх творчасць эксперты. Своеасаблівае творчае ток-шоу бліскуча правяла экс-віджэй аднаго музычнага тэлеканала Оля Палюшчык, якая напрыканцы вечара выканала ўласныя песні.

Лаўрэатамі фестывалю сталі групы "The Moonshiners" (яны ж атрымалі спецыяльны прыз партнёра фестывалю музычнай кампаніі BOOM), "Hight school", а безумоўным пераможцам была прызнана група "Floor Sixteen". Усе ўдзельнікі атрымалі дыпломы і памятныя падарункі. Вось такія пернікі.

15-ты раз са смехам да вас

З снежня завяршыўся 15-ты сезон Адкрытай Лігі КВЗ БДУ, якая з нядаўняга часу можа пахваліцца званнем афіцыйнай Лігі Рэспубліканскага моладзевага грамадскага аб'яднання "Беларуская Ліга КВЗ" і ТТА "АМІК у Рэспубліцы Беларусь". Іншымі словамі, наша Ліга выйшла на якасна новы ўзровень.

Аншлаг. Ніводнага вольнага месца ў зале. Водар хвалявання за кулісамі. Зорнае журы, у склад якога ўвайшлі монстры беларускага КВЗ: удзельнік легендарнай каманды БДУ, рэдактар Вышэйшай Лігі МС КВЗ і Першай Беларускай Лігі КВЗ – Леанід Купрыда, знакаміты кавэзэшнік і акцёр Віктар Толкач; удзельніца каманды КВЗ БДУ, тэлевядучая Марына Грыцук, вядомыя кавэзэшнікі Аляксандр Булынка і Аляксандр Тыку, а таксама пастаянны член журы (наш мясцовы Гусман) дырэктар Студгарадка БДУ Міхаіл Чарапеннікаў. Ім было складана ставіць адзнакі камандам, але такая ў іх праца.

"Без Даты", "Бухарэст", "Барада Чака Норыса" і "Мюслі" змагаліся не за жыццё, а за смех. Але, мабыць, як заўсёды, вопыт узяў сваё. Менавіта "Мюслі" дашлі да фінішу з найбольшай колькасцю балаў і заваявалі чэмпіёнскі тытул сезона 2009 і права прадстаўляць універсітэт на міжнародным фестывалі камандаў КВЗ у Сочы. Яшчэ адну важную ўзнагароду – кубак імя Андрэя Андрэева, які ўручаецца найлепшаму гульцу сезона, з рук Леаніда Купрыды атрымаў Мікалай Банасевіч з каманды "Без Даты".

Хутка будзе традыцыйны фестываль КВЗ БДУ, які падвядзе яшчэ некаторыя вынікі гэтага сезона і адкрые новы – у якім нас несумненна чакае шмат цікавага.

Упраўленне па справах культуры

Фота Ганны ІВАНОВАЙ

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

9 снежня быў разыграны "Кубак КВЗ" Студэнцкага гарадка БДУ. Сёлета званне самой вясёлай і знаходлівай каманды, а разам з ім і пераходны кубак, дасталася "Drobotenko.net" з інтэрната № 2.

***

10 снежня адбылася сустрэча студэнтаў з галоўным трэнерам жаночай Нацыянальнай зборнай па баскетболе Анатолем Буяльскім. Менавіта пад яго кіраўніцтвам нашы спартсменкі дасягнулі такіх вышынь, як удзел у летніх Алімпійскіх гульнях у Пекіне, а таксама 4 месца на Чэмпіянаце Еўропы ў Латвіі.

***

15 снежня ў ВСК "Універсітэцкі" адбыўся завяршальны этап спаборніцтваў на Кубак дырэкцыі ў рамках праграмы "Інтэрнатаўскія спрэчкі" – эстафета. У ёй перамогу святкавала каманда студсавета інтэрната № 3. А па выніках усяго турніру кубак заваявала каманда студсавета інтэрната № 1.

Паводле інфармацыі Студгарадка БДУ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Апладысменты, шмат смеху, крыкі, плакаты, дзяўчаткі і хлопчыкі, многа музыкі і жартаў. Прыкладна так прайшло 2 снежня. Прыблізна так скончыўся другі зімовы дзень. А пачалося ўсё насамрэч задоўга да гэтага. Недзе вось так...

Капуснік-2009: маладыя і зялёныя

"Давайце прыдумаем што-небудзь крэатыўнае, такое, каб ні ў кога падобнага не было!", "У мяне мегаідэя, слухайце ўважліва!", "Глядзіце, спачатку танчыць Дзіма, потым выходзяць дзяўчаты, ну, і ў канцы мішура, хлапушкі і гэтак далей..." Пазнаяце сябе? Прыкладна так усё пачыналася. Потым было шмат рэпетыцый... Генеральная рэпетыцыя, яшчэ разы 3 генеральная рэпетыцыя і, нарэшце, канцэрт – першы ў тваім студэнцкім жыцці. Першы і, спадзяёмся, не апошні. А потым усё было, як у кіно: вы выйгралі, вам апладзіравалі, фатаграфавалі, радасных і шчаслівых, віншавалі...

Ты ўжо амаль расслабіўся? Узбадзёрся! Наперадзе універсітэцкі "Капуснік" на пераходны кубак рэктара. Прывядзі ў парадак думкі, разамніся, з'еш шакаладку для ўзняцця настрою, і на барыкады. Бо наперадзе... А наперадзе 2 снежня і гасцінны ліцэй БДУ, рэктар Сяргей Уладзіміравіч Абламейка і шмат гледачоў. І, вядома ж, шмат славы (гэта пры ўмове, што хтосьці выйграе (накшталт тонкага намёку)).

Зараз я на хвілінку стану вашай персанальнай пошукавай сістэмай. Давайце ўвядзём "Капуснік БДУ". Та-а-ак, штогадовы агляд-конкурс, праводзіцца трэці год, пераможца конкурсу грантаў БДУ. Арганізатар – Студэнцкі Саюз БДУ пры падтрымцы ўпраўлення па справах культуры і ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю. М-м-м. Гэта табе не жарты, усё сур'ёзна і па-даросламу.

Гэтым разам у конкурсе прыняло ўдзел 17 факультэтаў. Нагадаю, што каманды-прадстаўніцы не так проста ў фінале. Яны ўжо выйгралі факультэцкі "Капуснік", і зараз самы час для вялікай сцэны. Пераможцы (гучаць фанфары) – радыёфізічны факультэт, або проста РФ (як яны сябе любяць называць). Залатая сярэдзіна ў філалагічнага факультэта. І трэцяе месца належыць механіка-матэматычнаму факультэту.

Зараз вы ведаеце, у каго кубак, засталося даведацца, дзе яны яго хаваюць, і... Або проста перамагчы ў наступным годзе. Напэўна, другі варыянт значна больш прывабны, бо мы не шукаем лёгкіх шляхоў? Прыкладна так.

Настасся ПЯТРОВІЧ

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Хто, калі не мы...

Позняя восень па-царску ўзнагародзіла ўдзельнікаў Рэспубліканскага студэнцкага форума "Народжаныя ў Беларусі", які праходзіў з 26 па 28 лістапада ў САК "Брыганціна". Дзякуючы сонечнаму, вельмі цёпламу для такой пары надвор'ю мы змаглі нацешыцца ўзрушальнай прыродай хваёвага бору.

Зрэшты, ва ўдзельнікаў форума было зусім няшмат часу на тое, каб глядзець па баках. Праграма, якую некалькі тыдняў рыхтавалі Міністэрства адукацыі Беларусі, Цэнтральны камітэт ГА "БРСМ", адміністрацыя Белдзяржуніверсітэта і студэнцкі актыў БРСМ БДУ, была вельмі насычанай і цікавай, асабліва для студэнтаў, якія прыехалі ў "Брыганціну" ўпершыню. У мерапрыемстве прынялі ўдзел каманды з 24 ВНУ краіны. У першы дзень, пасля ўрачыстага адкрыцця, на якім актыў БРСМ БДУ прэзентаваў сваю пярвічку і мэты форума, прайшлі псіхалагічныя трэнінгі на камандаўтварэнне, якія дапамаглі пазнаёміцца бліжэй. Увечары студэнты прынялі ўдзел у спартыўна-інтэлектуальнай гульні "Сутычка", якая дакладна запомнілася ўсім.

Наступны дзень пачаўся з традыцыйнай ранішняй зарадкі – зарадкі бадзёрасцю і добрым настроем. З дапамогай слайд-шоу і відэаролікаў каманды прэзентавалі "брэндавыя" мерапрыемствы сваіх ВНУ: розныя акцыі, конкурсы, працу студатрадаў, добраахвотніцкую працу – усё, чым займаецца іх актыў. Найважнейшым момантам стала абарона інавацыйных праектаў пярвічак БРСМ. Іх тэматыка даволі шырокая: інфармацыйна-адукацыйныя праекты, праекты па здаровым ладзе жыцця, патрыятычным выхаванні, валанцёрскім руху, арганізацыі студэнцкага вольнага часу. Па заслугах была ацэненая праца Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту – яны прапанавалі стварыць моладзевы адукацыйна-эканамічны клуб BASE, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта – яны шчыруюць над адраджэннем крыніцы ў вёсцы Пажэжын Маларыцкага раёна як нацыянальнага прыроднага помніка. Такама журы высока ацаніла фестываль новых магчымасцяў за здаровы лад жыцця "Positive Vision", прадстаўлены БДПУ імя Максіма Танка, праект "Студэнт года" Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і праект "Мы разам" Мінскага дзяржаўнага вышэйшага авіяцыйнага каледжа, які прадугледжвае сацыяльную працу з дзецьмі, якія знаходзяцца пад апекай дзяржавы. Менавіта гэтыя студэнцкія распрацоўкі атрымалі найвышэйшыя адзнакі суддзяў за значнасць, актуальнасць і абгрунтаванне.

Затым прайшоў круглы стол сакратароў пярвічак БРСМ з прадстаўнікамі дзяржустаноў па працы з моладдзю на тэму "Розныя погляды – адна мэта", якія абмеркавалі імідж арганізацыі і яе далейшае развіццё. На вечары творчых прэзентацый "Саюз моладзі" студэнты распавялі пра свае гарады і паказалі візітоўкі камандаў, пасля чаго з поспехам прайшла тэматычная дыскатэка "Made is USSR". Строі рэтра і адпаведная музыка стварылі сапраўды асаблівую атмасферу, як у песні: "Музыка нас связала, тайнаю нашай стала".

Годным завяршэннем форума стала прэс-канферэнцыя "Народжаныя ў Беларусі" з удзелам рэктара БДУ С. Абламейкі, першага сакратара ЦК ГА "БРСМ" Ю. Крывадубскага, намесніка старшыні прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі Р. Дапіра, начальніка ўпраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі І. Дыль, да іх удзельнікі мерапрыемства маглі наўпрост звярнуцца са сваімі пытаннямі і прапановамі.

– Вельмі задаволены, што нарэшце змаглі ўвасобіць гэтую ідэю ў жыццё, – адзначыў сакратар БРСМ БДУ Дзмітрый Мікулка. – Нягледзячы на дробныя недахопы, якія заўсёды спадарожнічаюць пілотным праектам, я лічу, што форум атрымаўся. Важна было сабраць самую актыўную частку нашай арганізацыі для таго, каб разам выпрацаваць агульную канцэпцыю развіцця, падзяліцца досведам, знайсці новых сяброў і зарадзіцца станоўчай энергіяй адзін ад аднаго.

У апошні дзень падчас узнагароджання па актавай зале хлопцы і дзяўчаты пусцілі нататнікі, у якіх абмяняліся каардынатамі і ўражаннямі ад форума. І гэта, на мой погляд, дакладная прыкмета таго, што ён прайшоў сапраўды паспяхова!

Юлія САКАЛОВА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

28 снежня 2009 года
Падпісана да друку 24.12.2009 г.
Зак. 1335. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by